РЭСПУБЛІКАНСКІ РЭФЕРЭНДУМ 2022
27 ЛЮТАГА
КАНСТЫТУЦЫЯ
У БУДУЧЫНЮ РАЗАМ



САПРАЎДНЫ ПРАДЗЮСАР!

9

ДОМ ДРЭВА КАХАННЯ

11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ЛЮТАГА 2022 г. СУБОТА № 39 (29661)

**КОРАТКА**

- **На Жаўтыкаўскай алімпіядзе па інфарматыцы беларускія школьнікі заваявалі 18 медалёў: 5 залатых, 7 сярэбраных і 6 бронзавых.**
- У Беларусі аб'ём выпрацоўкі электраэнергіі ў 2021 годзе вырас на 6,4 працэнта.
- **Экспарт беларускіх прадуктаў харчавання ў Кітай з 2016 года вырас амаль у 20 разоў.**
- Беларускія вучоныя заклікаюць спыніць будаўніцтва пагранічнай агароджы ў Белавежскай пушчы.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Летась было пабудавана амаль 135 тыс. кв. м арэнднага жылля. У такім жыллі ёсць патрэба ва ўсіх катэгорый грамадзян. Да канца пяцігодкі мы плануем выйсці на 600 тыс. кв. м у год, работа ў гэтым кірунку вядзецца. Мы падрыхтоўваем адпаведныя нарматыўна-прававыя акты і ў цэлым змяняем падыходы па будаўніцтве арэнднага жылля ў агульным аб'ёме. Акрамя таго, прапануем нашым грамадзянам будаваць арэнднае жыллё з наступным выкупам. Гэта будзе базавы прынцып далейшага будаўніцтва такога віду жылля».*

ISSN 1990 — 763X

# ДЗЕЛЯ БУДУЧЫНІ

**Заўтра рэферэндум — важная падзея ў жыцці не толькі нашай краіны, але і кожнага з нас. Паўдзельнічайце ў ёй дзеля сябе і дзеля сваіх дзяцей і ўнукаў**



Фота БелТА.

# СТАЛІЧНЫ РУХ

Паласа выключна для грамадскага транспарту і пераход на электратранспарт

**Мінчан і гасцей галоўнага горада краіны сёння перавозіць грамадскі транспарт па 274 гарадскіх маршрутах, з іх 205 — аўтобусных, 61 — тралейбусны і 8 — трамвайных. Па праграме развіцця электрычнага транспарту на 2021—2025 гады прадугледжаны плаўны пераход грамадскага транспарту на электрычную цягу. Прадугледжана закупка 350 электробусаў і 1000 тралейбусаў з аўтаномным ходам, а вось звычайныя аўтобусы купляць не будуць. Пра гэта расказаў дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Сталічны транспарт і сувязь» Валерый ШКУРАТАЎ.**

## У ЭЛЕКТРАКАРАЎ БОЛЬШ ДЫНАМІЧНЫ ХОД

Ён адзначыў, што ў цэлым сёння перавозка жыхароў горада ажыццяўляецца па маршрутнай сетцы працягласцю больш за чатыры тысячы кіламетраў. «У цэлым мы ацэньваем узровень гарадскіх перавозак дастаткова высока», — даў ацэнку работы транспартнікаў дырэктар прадпрыемства.

Расказаў ён і аб асноўных зменах на вуліцах горада, якія магчыма ўбачыць і выпрабаваць пасажырам у цяперашняй пяцігодцы.

СТАР. 4



З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Мы маем самыя высокія тэхналогіі, маніпуляцыі, аперацыі. Так павінна быць усюды»

## Прэзідэнт Беларусі наведаў Мінскі навукова-практычны цэнтр хірургіі, трансплантапогіі і гематалогіі

**Навукова-практычны цэнтр хірургіі, трансплантапогіі і гематалогіі быў створаны на базе 9-й бальніцы сталіцы амаль чатыры гады таму. Аляксандр Лукашэнка пазнаёміўся з новымі тэхналогіямі, укаранёнымі ў інтэнсіўную тэрапію, навуковымі дасягненнямі цэнтра, метадыкамі правядзення аперацый. Па традыцыі кіраўнік краіны наведаў «чырвоную зону» для хворых на ковід. Пасля экскурсіі па цэнтры Прэзідэнт пагутарыў з калектывам установы і адказаў на пытанні медыкаў.**

### НАМ ЁСЦЬ ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА

«Сёння для нашай краіны гэта ўнікальны навуковы цэнтр. Унікальнасць яго ў тым, што ён адзіны ў Беларусі шматпрофільны медыцынскі цэнтр, дзе разам з высокімі тэхналогіямі (аперацыі па трансплантацыі органаў) развіваюцца абсалютна ўсе напрамкі сучаснай медыцыны: гематалогія, онкагематалогія, трансплантацыя коснага мозгу і клетак», — расказаў кіраўнік установы Алег Румо, дадаўшы, што з-за пандэміі ковіду прыйшлося стаць і інфекцыяністамі.

Таксама цэнтр праводзіць навуковыя даследаванні па ўсіх кірунках сучаснай медыцыны. Такім чынам, ужо ўкаранёныя медыкамі 188 метадаў лячэння і дыягностыкі. У Мінск па высокапрафесійную дапамогу прыязджаюць пацыенты з розных краін, у тым ліку такіх высокаразвітых, як Ізраіль і Японія.

2021-ы ковідны год стаў для цэнтра вельмі паспяховым: зарабілі на экспарце медпаслуг больш за 10 мільёнаў долараў. Гэта 70 % ад сумы зробленай на медпаслугах Мінскам і 25 % экспарту медпаслуг краіны. Летась колькасць замежных пацыентаў склала амаль 2000.

«Гэта галоўны паказчык вашай паспяховасці. Калі да вас паехалі людзі з такіх развітых у медадносінах краін, як Ізраіль, значыць, вас прызналі і вы хлеб не дарма ясцё», — пракаментаваў Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначыў дырэктар цэнтра, большасць зробленых грошай ідзе на заробкі супрацоўнікаў, набыццё абсталявання, упарадкаванне цэнтра. Заработная плата медперсаналу Мінскага цэнтра хірургіі, трансплантапогіі і гематалогіі самая высокая ў краіне. Сярод урачоў сярэдні заробак каля 4000 рублёў, а медсясцёр — 2500. Унікальныя хірургі і анестэзіёлагі зарабляюць 1800—5000 долараў у месяц.

«Асноўная наша задача — удасканаленне трансплантапагічнай дапамогі. Нам ёсць чым ганарыцца. Для мяне апошняя два гады важныя, таму што мы, нягледзячы на ковід, гэту дапамогу захавалі», — сказаў Алег Румо.

Ён заўважыў, што ўрачы цэнтра працуюць, каб палепшыць якасць аказання дапамогі пацыентам Беларусі, а калі будзе магчымасць, і зарабіць на сваіх паслугах.

«Ты так сціпла кажаш пра зарабіць. Слухай, ва ўсім свеце зарабляюць на гэтым. А мы такія дабрадушныя славяне, нам нясёмка на здароўі зарабляць. Але пытанне не толькі ў заробках, а ў тым, каб гэтыя грошы не вывозілі ў Германію ці яшчэ куды. Таму нам неабходна тут рабіць высокатэхналагічныя ўмяшанні. У гэтым сэнс маёй падтрымкі і дзяржавы ў цэлым», — падкрэсліў кіраўнік краіны, дадаўшы, што асабіста хоча ад дырэктара: каб у кожнай вобласці, міжраённых цэнтрах навучылі працаваць медыкаў і не шкадавалі перадаваць свой вопыт моладзі.

### МАЛАІНВАЗІЎНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ЗАМЕСТ СКАЛЬПЕЛЯ

На пачатку размовы з калектывам Аляксандр Лукашэнка падзякаваў урачам за выкананне абяцання па стварэнні сучаснага цэнтра і расказаў, да чаго павінна імкнуцца кожная сфера.

«У кожнай галіне мы маем самыя высокія тэхналогіі, маніпуляцыі, аперацыі, работы праводзім ад дрэваапрацоўкі і заканчваючы аховай здароўя. Так павінна быць усюды. Калі мы спынімся і гэтых маячкоў не будзе, да якіх трэба імкнуцца, краіна знікне», — сказаў Прэзідэнт.

Ён назваў сваё асноўнае патрабаванне да ўрада і Міністэрства аховы здароўя.

«Маё патрабаванне да ўрада і Міністэрства аховы здароўя, каб мы не будавалі жалезабетоннае ўсё. Зараз у клініках такі жалезабетон над галавой і такія сцены ніхто не робіць, — сказаў Прэзідэнт. — Мы павінны лічыць грошы. І міністру я гавару, паглядзі, каб там нічога не было лішняга».

Нагадаў ён і пра тое, што неабходна ўтрымаць для медыкаў заробкі, устаноўленыя з ковіднымі выплатамі. «Нам, каб людзі працавалі, неабходна імкнуцца трымаць высокі ўзровень заработнай платы. Але не ўраўнілаўку. Мне падабаецца ваша дыферэнцыяцыя заробкаў. «Свяцілы вялікія» могуць атрымліваць 4-5 тысяч долараў, а тыя, што толькі імкнуцца, будуць менш атрымліваць. Я не скажу, што мы азалацілі нашых урачоў, але цярпіма. Будзем рабіць усё, каб было лепш і больш», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Рэзюмуючы тэму, ён адзначыў, што сістэма аховы здароўя выбудавана, ідзе мадэрнізацыя сферы. Засталося толькі абнавіць старыя будынкі, пабудаваць некалькі новых, аснасціць іх абсталяваннем, «каб вы не з сякерай і скальпелем у аперацыйную заходзілі, а з малаінвазіўнымі тэхналогіямі».

Пацікавіліся медыкі і думкамі кіраўніка краіны наконт досведу стварэння ўніверсітэцкіх клінік. Падобны праект раней быў рэалізаваны ў Гродне на базе абласной клінічнай бальніцы і медуніверсітэта. «Яны будуць развівацца — і клінікі, і ўніверсітэты. Пытанне ў іх спалучальнасці», — адзначыў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што інтэграваць універсітэты і клінікі неабходна так, каб яны не страцілі самастойнасць, але працавалі ва ўзаемадзеянні.

### ДЫКТАТУРА ДЛЯ ЦЭН

Адно з пытанняў медыкаў датычылася цэнаўтварэння і цэн. Вось што Прэзідэнт сказаў на гэту тэму: «Цэны, цэнаўтварэнне — самыя цяжкія праблемы не ў плане таго, каб стрымаць цэны. У нас, шчыра кажучы, дыктатура ў гэтым плане: сказаць — заўтра наогул не зменіцца ні адна цана». Але, звярнуў увагу Прэзідэнт, на цэны ў краіне ўплывае знешняя інфляцыя.

«Інфляцыя ў асноўным збоку да нас прыходзіць, таму што там абясцэніліся грошы, там да гэтага часу вытворчасць не аднавілася. Рост цэн на нафту, металы і іншае ў два-тры разы падаражалі. І як я буду стрымліваць цану на трактар, напрыклад. Калі я яе пачынаю стрымліваць, вытворчасць разваліцца, таму што ў іх кошт нізкі, а сабекошт расце. Калі ён перавысіць кошт самога вырабу — вытворчасць спыніцца, — падкрэсліў кіраўнік краіны. — Таму гэта вельмі тонкая тэма. Я разумею, яна б'е па людзях, але мы не жывём у ізаляваным свеце. І вы ведаеце, нават Амерыка, якая быццам самадастатковая, мае практычна тую ж інфляцыю, што і ў нас».

Кіраўнік краіны згадзіўся, што інфляцыя за год больш чым дзевяць працэнтаў — высокая, але «жыць можна».

### НАЦЫЯНАЛІЗМ НЕ СУПАСТАЎНЫ З БЕЛАРУСАМІ

Не абышлі бокам медыкі і ваенную спецаперацыю ва Украіне — тэма зараз на вуснах у кожнага. Па словах Прэзідэнта, прычына ўсіх падзей — кіраўніцтва краіны. Але паводле Аляксандра Лукашэнкі, аснова для развіцця ва Украіне была іншая ў параўнанні з былымі краінамі СССР. Назіраць за гэтым яму даводзілася падчас службы ў пагранічных войсках.

«Мне прыйшлося праехаць ад Прыбалтыкі ўсю Заходнюю Украіну, кіеўскі цэнтр быў. І я тады ўжо бачыў той нацыяналізм, які быў несупастаўны з беларусамі. Калі я зайшоў у львоўскі КДБ, у начальніка камітэта пытаюся: «Вялізны будынак, у вас тут больш за тысячу чалавек працуе. Ва ўрадзе некаторых краін менш». Ён кажа: «Гэта таму, што тут, у Львоўскай вобласці, на Заходняй Украіне, такі нацыяналізм, што вы, беларусы, проста такога не разумееце». Гэта была тая дрэнная аснова, якая дала свае парасткі. А ўсё астатняе — палітыкі», — тлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Па яго словах яшчэ адна з прычын канфлікту ў тым, што людзям забаранілі размаўляць на той мове, на якой хацелі.

### «ТАКОЙ ЯЎКІ Я НЕ ЧАКАЎ»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў высокую яўку на датэрміновым галасаванні па Канстытуцыі. Яна па выніках трох дзён датэрміновага галасавання ўжо склала амаль 25 %.

«Такой яўкі я не чакаў. Думаў, будзе менш», — сказаў Прэзідэнт. Ён звязвае гэта ў тым ліку з вялікай работай, якая была праведзена да рэферэндуму з людзьмі ў рэгіёнах, на прадпрыемствах.

«Малайцы і журналісты, і эксперты, і спецыялісты. Я гляджу, ужо праехалі па ўсёй краіне. Тэлебачанне, СМІ ў гэтым плане працавалі. Усе-ўсе. Гэта дало свой эфект. І я не чакаў такой яўкі. Часам нават чэргі бачыў на датэрміновым галасаванні», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Кантэкст

# БЕЛАРУСЬ ГАТОВА ЗРАБІЦЬ УСЁ МАГЧЫМАЕ ДЛЯ ЎСТАНАЎЛЕННЯ МІРУ ВА УКРАІНЕ

**Прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі канстатаваў, што ніхто з сусветных лідараў не гатовы гарантаваць яе прыняцце ў НАТА і накіраваць сваіх ваенных ва Украіну. Аб гэтым ён заявіў у відэазвароце да ўкраінцаў, паведаміла ТАСС. Паводле яго слоў, краіны НАТА не гатовы прадаставіць Украіне гарантыі бяспекі і прыняць яе ў альянс. «Хто гатовы даць Украіне гарантыю ўступлення ў НАТА? Шчыра: усе баяцца», — сказаў Уладзімір Зяленскі, які пазней агучыў прапанову расійскаму боку аб перагаворах.**

Таксама стала вядома, што Зяленскі падпісаў указ аб усеагульнай мабілізацыі ў краіне. Акрамя таго ён падпісаў указ аб утварэнні стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага. Раней Вярхоўная Рада зацвердзіла ўказ прэзідэнта Украіны аб увядзенні ваеннага становішча на ўсёй тэрыторыі краіны. Скажу шчыра, гэтыя хаатычныя дзеянні свядчаць пра агонію ўкраінскай улады, «шайкі з Банкавай» (вуліца ў Кіеве, дзе знаходзіцца Офіс прэзідэнта), як яе між сабой называлі самі ўкраінцы.

Расійскія ваенныя выступаюць гарантам сітуацыі. Вельмі важная навіна — міністэрства абароны Расіі пацвердзіла ўзяцце пад кантроль Чарнобыльскай АЭС, паведаміла БелТА. «Радыеактыўны фон у раёне атамнай электрастанцыі ў норме. Персанал АЭС працягвае абслугоўваць аб'екты АЭС у штатным рэжыме і адсочвае радыеактыўную абстаноўку, — падкрэсліў на брыфінгу афіцыйны прадстаўнік Мінабароны РФ генерал-маёр Ігар Канашэнкаў. — Сумесныя дзеянні расійскіх дэсантнікаў і ўкраінскіх ваеннаслужачых батальёна аховы АЭС па абароне станцыі з'яўляюцца гарантыяй таго, што нацыяналістычныя фарміраванні або іншыя тэрарыстычныя арганізацыі не змогуць скарыстацца існуючай у краіне абстаноўкай для арганізацыі ядзернай правакацыі».

Пасля стала вядома пра стасункі па ўкраінскім пытанні лідараў Расіі і Кітая. Уладзімір Пуцін праінфармаваў Сі Цзіньпіна аб гісторыі ўкраінскага пытання і ваеннай спецаперацыі на ўсходзе Украіны. Расійскі лідар адзначыў, што Злучаныя Штаты і НАТА доўгі час ігнаравалі разумныя апасенні Расіі ў галіне бяспекі, неаднаразова парушалі свае абавязацельствы і працягвалі ваеннае разгортванне на ўсходнім флангу. Сі Цзіньпін адзначыў: апошнім часам сітуацыя на ўсходзе Украіны перажывае імклівыя змены, што прыцягвае вялікую ўвагу міжнароднай супольнасці. «Неабходна адмовіцца ад менталітэту халоднай вайны, прымаць да ўвагі і паважаць законныя інтарэсы бяспекі ўсіх краін і шляхам перагавораў сфарміраваць збалансаваны, эфектыўны і ўстойлівы механізм еўрапейскай бяспекі», — заявіў Сі Цзіньпін. Ён адзначыў, што Кітай падтрымлівае Расію і Украіну ў вырашэнні пытання шляхам перагавораў.

Уладзімір Пуцін гатовы адправіць у Мінск на перагаворы з Украінай дэлегацыю РФ. Аб гэтым паведаміў журналістам прэс-сакратар расійскага лідара Дзмітрый Пяскоў, паведаміла ТАСС. «У адказ на прапанову Зяленскага Уладзімір Пуцін гатовы накіраваць у Мінск расійскую дэлегацыю на ўзроўні прадстаўнікоў Міністэрства абароны, Міністэрства замежных спраў і Адміністрацыі прэзідэнта для перагавораў з украінскай дэлегацыяй», — адзначыў ён. Дзмітрый Пяскоў таксама паведаміў, што Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запэўніў расійскага лідара Уладзіміра Пуціна, што Мінск гатовы стварыць усе ўмовы для перагаворнага працэсу РФ і Украіны.

Са свайго боку Беларусь па-ранейшаму гатова зрабіць усё магчымае для ўстанаўлення міру ва Украіне. Аб гэтым заявіў журналістам прэс-сакратар МЗС Беларусі Анатоль Глаз, каменціруючы магчымасць арганізацыі ў Мінску перагаворнага працэсу для ўстанаўлення міру ва Украіне, паведаміла БелТА. «Мы заўсёды казалі аб сваёй гатоўнасці зрабіць усё магчымае для ўстанаўлення міру ва Украіне, спынення кровапраліцця паміж брацкімі славянскімі народамі. Беларусь заўсёды выступала за вырашэнне любых пытанняў дыпламатычным спосабам і шляхам перагавораў», — сказаў Анатоль Глаз. Ён нагадаў аб вопыце работы трохбаковай кантактнай групы ў Мінску, калі ўсе бакі выказвалі толькі падзякі на адрас беларускага боку. Паводле слоў прадстаўніка МЗС, гэты вопыт красамоўна пацвярджае адказны падыход Беларусі да такіх рэчаў. «У бягучай жа сітуацыі сам бог загадаў нам зрабіць усё магчымае. У сувязі з гэтым, калі бакі дасягнуць дамоўленасці, мы будзем гатовы аказаць любое садзейнічанне і зрабіць усё, што ад нас залежыць», — падкрэсліў Анатоль Глаз.

Украіна павінна пайсці на перагаворы з Расіяй, бо гэта прынясе больш дывідэндаў, чым эскалацыя канфлікту і ў выніку пройгрыш у вайне. Аб гэтым раней заявіў журналістам Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. І прапанаваў Мінск у якасці надзейнай пляцоўкі для перагавораў.

**Пётр ДУНЬКО.**

# ГРАМАДЗЯНЕ АКТЫЎНА ГАЛАСУЮЦЬ

**Аб гэтым учора заявіў журналістам старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Ігар КАРПЕНКА**



**Кіраўнік Цэнтрвыбаркама адзначыў, што найбольш актыўныя выбаршчыкі ў абедзенны перапынак і ў вячэрні час. За тры дні датэрміновага галасавання яўка склала 24,07 %. Тройку лідараў па-ранейшаму складаюць Гомельская, Магілёўская і Брэсцкая вобласці.**

На ўчарашні дзень для работы на рэферэндуме ўжо акрэдытавана 195 міжнародных назіральнікаў. Па словах Ігара Карпенкі, павялічылася і колькасць нацыянальных — іх ужо практычна 45 тысяч.

— Мы стварылі ўсе ўмовы для таго, каб грамадзяне змаглі спакойна прыйсці на ўчасткі і выказаць сваю пазіцыю адносна пытання, якое вынесена на рэферэндум, — падкрэсліў кіраўнік ЦВКа. — Галасаванне ідзе ў штатным рэжыме, абстаноўка на ўчастках спакойная, арганізаваная, зладжаная.

Падзякаваўшы ўсім тым, хто задзейнічаны ў працэсе арганізацыі галасавання, Ігар Карпенка адзначыў, што істотных пытанняў і заўваг не ўзнікае. «Я пагляджу па ўсіх узроўнях камісій, уключаючы цэнтральную, — у нас крыху больш чым 300 розных зваротаў, — паведаміў старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. — Я не сказаў бы, што гэта скаргі. Дзесьці ёсць і прапанова, а дзесьці і ўдакладненне: просяць патлумачыць, дзе ім галасаваць, куды звярнуцца і іншае. Гэта тэхнічныя пытанні, якія дастаткова аператыўна вырашаюцца».

# «МЫ ЎБАЧЫЛІ СВАБОДНУЮ СУВЕРЭННУЮ КРАІНУ»

**Дэпутаты сустрэліся з прадстаўнікамі міжнароднай місіі назіральнікаў з Італіі**

Група замежных парламентарыяў гэтымі днямі назірае за правядзеннем рэферэндуму па змяненнях і дапаўненнях да Канстытуцыі нашай краіны. Амаль усе дэлегаты з'яўляюцца членамі Камітэта салідарнасці з Беларуссю. Камітэт быў арганізаваны яшчэ ў жніўні 2020 года ў Італьянскай Рэспубліцы з мэтай супрацьдзеяння тым інфармацыйным атакам, якім падвергнулася наша краіна. Яшчэ адна з ключавых мэт аб'яднання — давядзенне аб'ектыўнай інфармацыі да італьянцаў аб тых працэсах, якія адбываюцца ў нас.

— Нягледзячы на міжнародныя падзеі, рэферэндум у Беларусі — вельмі важнае мерапрыемства, — адзначыў **кіраўнік міжнароднай місіі назіральнікаў з Італіі, прэзідэнт Камітэта салідарнасці з Беларуссю Матэа ПЕДЖЫА**. — Мы падтрымліваем палітыку Прэзідэнта Лукашэнкі і ваш народ, які, у адрозненне ад нашага, відавочна, не стане калоніяй Злучаных Штатаў Амерыкі. Мы ўбачылі, што ў Беларусі жыве мірны народ, які гатовы з намі сябраваць і не з'яўляецца ніякай пагрозай для нас. Мы ўбачылі свабодную суверэнную краіну, якая не гатовая да таго, каб хтосьці ёй дыктаваў сваю ўнутраную і знешнюю палітыку. Мы хочам, каб Італія ўзяла прыклад з Беларусі.

Як паведаміў **член Сената Італьянскай Рэспублікі, член Камуністычнай партыі Эмануэле ДЭСІ**, дэлегацыя з Італіі ўжо ўбачыла, што Беларусь — абсалютна свабодная, дэмакратычная дзяржава, і яны спадзяюцца, што рэферэндум будзе карысны для краіны.

Падзякаваўшы міжнародным назіральнікам за цікавасць, якую яны праяўляюць да канстытуцыйнага працэсу ў нашай дзяржаве, **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ** заўважыў, што мы сёння жывём у хуткі гістарычны час. «Гэта значыць, што ўсе гістарычныя працэсы паскараюцца, змены адбываюцца ва ўсіх сферах жыцця, — удакладніў парламентарый. — Гэта накладвае на нас вялікую адказнасць. Нам неабходна хутка і якасна рэагаваць на ўсе гістарычныя змены, якія адбываюцца».

Па словах **члена Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Сяргея СЫРАНКОВА**, гэтая сустрэча будзе садзейнічаць далейшаму развіццю беларуска-італьянскіх адносін і ў цэлым умацаванню іміджу нашай краіны на міжнароднай арэне. «Нягледзячы на дастаткова шырокае асвятленне тых грамадска-палітычных мерапрыемстваў, якія адбываюцца ў нашай краіне, заходнімі СМІ, якіх мы называем сродкамі масавай дэзінфармацыі, у нас ва ўсіх краінах Еўропы без выключэння, у тым ліку ў ЗША, вельмі шмат сяброў, палітыкаў, дыпламатаў, якія аб'ектыўна ацэньваюць тую сітуацыю, якая складваецца ў нашай краіне, — акцэнтаваў увагу дэпутат. — Яны падтрымліваюць беларускі народ, у тым ліку і з трыбуны Парламента Еўрасаюза».

**Вераніка КАНЮТА.**

# ПАРУШЭННЯЎ НЕ ВЫЯЎЛЕНА

**Як праходзіць датэрміновае галасаванне на адным з участкаў Жодзіна**

**У Жодзіне створана 20 участкаў для галасавання на рэферэндуме. Лагойскі выбарчы ўчастак № 13 месціцца ў будынку новай дзіцячай паліклінікі, якую днямі адкрылі.**

— Чаму менавіта Лагойскі? — запыталася я ў **старшыні ўчастковай выбарчай камісіі Аксаны ТУШЫНСКАЙ**.



— Усё проста. Непадалёку знаходзіцца вуліца Лагойская, і частка яе жыхароў будзе галасаваць менавіта тут, — растлумачыла Аксана Віктараўна. — Усяго ў нас зарэгістравана 1275 выбаршчыкаў — жыхары прыватнага сектара і новага мікраёна, дзе пабудавана шмат жылых дамоў, пражывае вялікая колькасць шматдзетных, маладых сем'яў. Людзі актыўна ідуць выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю. Трыццаць адзін чалавек будзе галасаваць упершыню. Ім падрыхтавалі іменныя паштоўкі, блакноты, ручкі.

На ўчастку выконваюцца ўсе прафілактычныя супрацькавідныя меры: антысептык, пальчаткі, маскі. Уладкавана адна урна для датэрміновага галасавання і кабінка без шторак, каб туды паступала свежае паветра падчас праветрывання памяшкання. У асноўны дзень галасавання, 27 лютага, участак будзе перанесены ў прасторнае фае новай дзіцячай паліклінікі з прыгожым вадаспадам.Там будуць уладкаваны тры кабінкі і адна кабінка для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Уваход у будынак абсталяваны пандусам, у памяшканні створана безбар'ернае асяроддзе. Людзі са слабым зрокам змогуць скарыстацца лупай, шрыфтам Брайля.

— Грамадзяне ведаюць, для чаго яны сюды ідуць. Кіраўнікамі горада, арганізацый і прадпрыемстваў у калектывах была наладжана работа дыялогавых пляцовак, сустрэч, дзе ім растлумачылі ўсе нюансы галасавання, адказалі на пытанні, якія іх цікавілі, пракансультавалі, — кажа Аксана Тушынская.

— Найбольш грамадзяне прыходзяць у другой палове дня па дарозе з работы дамоў. На БелАЗе, напрыклад, многія працуюць да 16.00. Забіраюць дзяцей з дзіцячага сада і прыводзяць сюды малых. Дзеці ведаюць, што тут адкрылася новая паліклініка, яны могуць пагуляць на пляцоўцы, абсталяванай рознымі атракцыёнамі.

Датэрміновае галасаванне праходзіць з 22 да 26 лютага з 10.00 да 14.00 і з 16.00 да 19.00. Падчас перапынку урна запячатваецца, заклейваецца прораз для бюлетэняў. Увесь працэс завяраецца старшынёй і членам камісіі ў прысутнасці назіральніка. Урна змяшчаецца ў сейф і знаходзіцца пад аховай дзяжурнага міліцыянера.

У сярэднім штодзень галасуе пяць — сем працэнтаў грамадзян. Па даных на сярэдзіну чацвярга, прагаласавала каля 20 % ад агульнай колькасці зарэгістраваных выбаршчыкаў.

Пенсіянерка Ганна Іванаўна прыйшла аддаць свой голас разам з мужам Валерыем Аляксеевічам.

— Я інвалід, таму мне прасцей прагаласаваць датэрмінова, у спакойнай абстаноўцы, паколькі 27 лютага будзе шмат людзей. Я аддаю свой голас за мір, стабільнасць, спакой у краіне, — кажа жанчына.

— У мяне вельмі шчыльны рабочы графік, у нядзелю я працую, — адзначае Святлана. — Сумясціць работу, асабістыя справы і галасаванне цяжка. А галасаванне — гэта справа дзяржаўнай важнасці.

Юля прыйшла аддаць голас за змяненні і дапаўненні, што ўнесены ў праект новай Канстытуцыі.

— Калі мы будзем разам, мы будзем сілай, зможам з упэўненасцю ісці ў будучыню, — лічыць дзяўчына.

Падчас датэрміновага галасавання заўвагі і скаргі на работу ўчастковай камісіі ад грамадзян не паступалі, запэўніла **назіральнік ад Жодзінскай гарадской арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў навукі і адукацыі Алена АХРАМОВІЧ**. Парушэнняў з боку членаў камісіі назіральнікамі таксама выяўлена не было.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота БелТА.**

# І ЗРАНКУ, І ВЕЧАРАМ...

**Менавіта ў гэты час прыходзіць найбольшая колькасць выбаршчыкаў на ўчастках для датэрміновага галасавання**

**Такая сітуацыя на многіх участках Гродзенскага раёна. Выбарчы участак № 30 размясціўся ў школе аграгарадка Путрышкі. У спісе — крыху больш за тысячу чалавек. За тры дні амаль 20 % з іх прагаласавалі.**


Фота rgazeta.by

Як правіла, загадзя прыходзяць тыя, хто не зможа ўдзельнічаць у рэферэндуме ў нядзелю, 27 лютага. Магчымасць аддаць свой голас да асноўнага дня галасавання — з аўторка да суботы — выбаршчыкі ацэньваюць станоўча. Па словах **старшыні камісіі дадзенага ўчастка Віталя БОЛДАКА**, большая актыўнасць грамадзян вечарам. Звязана гэта з тым, што людзі вяртаюцца з працы і заходзяць на ўчастак, каб выканаць свой грамадзянскі абавязак. А вось раніцай прыходзяць больш людзей сталага ўзросту.

Старшыня камісіі дэманструе наглядны матэрыял. Тут можна азнаёміцца з артыкуламі дзеючай Канстытуцыі, а таксама з праектам унесеных змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон. Да таго ж члены камісіі гатовы патлумачыць усе арганізацыйныя моманты.

Асаблівыя ўмовы створаны для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Напрыклад, чалавек з аслабленым зрокам можа скарыстацца спецыяльным тактыльным бюлетэнем, які дазваляе захаваць тайну галасавання.

У аграгарадку, дзе адкрыты два выбарчыя ўчасткі, найбольшы наплыў людзей чакаюць у нядзелю — асноўны дзень галасавання. Многія жыхары ведаюць, што на ўчастках у гэты дзень працуе буфет, падрыхтавана канцэртная праграма. Такая атмасфера стварае адчуванне свята.

Як паведамілі ў абласной камісіі па рэферэндуме, у Гродзенскай вобласці створана 608 участкаў для галасавання, у складзе камісій 6801 чалавек. У большасці гэта прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый, працоўных калектываў. Усе жыхары рэгіёна атрымалі паведамленні, як друкаваныя, так і электронныя, аб месцы і тэрмінах галасавання. Ёсць і закрытыя ўчасткі, іх 37. Яны размешчаны ў санаторыях, медыцынскіх установах, воінскіх часцях. Больш за ўсё ўчасткаў для галасавання ў Гродзенскім, Лідскім і Слонімскім раёнах. Усюды прымаюцца меры бяспекі з улікам эпідэміялагічнай абстаноўкі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY**

Блізкая ўлада

# ГОЛАС ВЕТКАЎШЧЫНЫ ПАЧУТЫ

**Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ свой працоўны візіт ва ўсходні рэгіён Гомельскай вобласці скарыстаў для правядзення прамой тэлефоннай лініі і прыёму грамадзян — жыхароў райцэнтра. Аднак праблемных пытанняў міністру не паступіла, затое адбылася размова з рэгіянальнымі журналістамі.**



Міністр інфармацыі падзяліўся сваімі назіраннямі за практыкай выязных сустрэч і прыёмаў на тэрыторыі раёнаў. Адсутнасць патоку зваротаў — паказчык таго, што мясцовая ўлада адгукаецца на праблемы, якія хвалююць людзей, лічыць ён.

— Калі на месцах ёсць дыстанцыя, там і звароты па любых пытаннях: ад добраўпарадкавання двара да дробных камунальных тэм. Людзі проста не могуць дастукацца. І тады скардзяцца і на адпіскі, і на адгаворкі, і на фармалізм. Часам збоку нейкая праблема выглядае малазначнай, але для канкрэтнага чалавека гэта рэальная складанасць у жыцці. Твар у твар, лічу, — самы дзейсны метад вырашэння сацыяльных і бытавых праблем, — падзяліўся міністр.

Што датычыцца Веткаўскага раёна, то сёння тут актыўна ўкараняюць практыку штомесячнай выязной работы ўсіх службаў раёна ў сельскія населеныя пункты.

Як адзначыла **намеснік старшыні Веткаўскага райвыканкама Наталля ДАРАШЭВІЧ**, праводзяцца сустрэчы па самых розных пытаннях, прыёмы грамадзян вядзе кіраўніцтва райвыканкама, з дакладам па кожным кірунку работы выступаюць прадстаўнікі адказных службаў. Праблемныя тэмы, вядома, бяруцца на кантроль для вырашэння.

Уладзімір Пярцоў звярнуў увагу, што значную ролю ў зняцці сацыяльнай напружанасці сярод людзей адыгрываюць рэгіянальныя сродкі масавай інфармацыі. Прэса павінна рэагаваць і пісаць пра спадзяванні і праблемы, якія хвалююць жыхароў раёна.

Калі размаўляць з людзьмі, растлумачваць ім тую ці іншую складаную сітуацыю, то, сутыкнуўшыся з фэйкавай, правакацыйнай навіной, яны ўжо змогуць супаставіць факты, прааналізаваць і зрабіць правільныя высновы. У гэтым і праяўляецца мудрасць народа, падкрэсліў Уладзімір Пярцоў.

Актуальныя тэмы і перспектывы работы ў сучаснай інфармацыйнай прасторы з першых вуснаў ад кіраўніка ведамства пачулі, а пасля і абмеркавалі журналісты Веткаўшчыны. Магчымасцю атрымаць адказы на хвалюючыя пытанні скарысталіся супрацоўнікі рэдакцыі газеты «Голас Веткаўшчыны». Міністр акрэсліў актуальныя задачы, якія стаяць перад беларускімі СМІ, закрануў пытанні якаснай журналісцкай работы ў сацыяльных сетках, падрыхтоўкі маладых кадраў у рэдакцыях і цікавасць да грунтоўных аналітычных матэрыялаў. Кіраўнік ведамства распавёў, што пасля рэферэндуму галіну чакае трансфармацыя, не выключана стварэнне медыяхолдынгаў і ўзбуйненне рэгіянальных СМІ.

Між тым удзельнікі сустрэчы дзяліліся і асабістымі водгукамі на ключавыя аспекты Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Закранулі пытанні барацьбы з пандэміяй COVID-19 у Беларусі, праблемы прымянення заходніх санкцый і вядзення інфармацыйных войнаў.

Уладзімір Пярцоў звярнуў увагу на тое, як на этапе дыскусійных пляцовак, дыялогаў у працоўных калектывах, са спікерамі, абмеркавання ў сацыяльных сетках былі прапанаваны змяненні і дапаўненні ў Асноўны Закон Беларусі.

Міністр лічыць, што да падзей 2020 года ў беларускім грамадстве быў даволі нізкі ўзровень палітызацыі. Цяпер людзі, перажыўшы шок ад дзеянняў дэструктыўных элементаў у 2020 годзе, не могуць быць па-за палітыкай і актыўна абмяркоўваюць усе нюансы і тэмы. У Год гістарычнай памяці асаблівая задача данесці да моладзі: беларусы — нашчадкі пераможцаў, подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ніколі і ніхто не можа абясцэніць.

— І журналістам, і ідэолагам трэба зрабіць каласальны аб'ём работы, каб дастукацца да кожнага маладога чалавека, расказаць, што было і што магло б быць, што б нас чакала. Таму што па той бок нашы апаненты робяць усё, каб зніваліраваць, знішчыць ролю Вялікай Перамогі. Яны хочуць гэта вынішчыць любой цаной. Гэта іх галоўная ідэалагічная, інфармацыйная задача, якую нельга дапусціць, — зазначыў Уладзімір Пярцоў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# СТАЛІЧНЫ РУХ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Задача нам зразумелая — трэба сысці ад дызельнай цягі. Сёння ўдзельная вага электратранспарту ва ўсім аб'ёме пасажырскіх перавозак складае каля 40 %. Да канца пяцігоддзя гэты паказчык павінен скласці не менш за 70 %, калі будзе выканана праграма», — падзначыў перспектывы прадстаўнік ДП «Сталічны транспарт і сувязь». Нягледзячы на тое, што кошт электратранспарту вышэйшы, чым звыклага аўтатранспарту, з-за неабходнасці стварэння зараднай інфраструктуры, пасля эксплуатацыйныя выдаткі на экалагічны транспарт ніжэйшыя, ён больш просты ў кіраванні і абслугоўванні, надзелены запатрабаванымі ў пасажыраў функцыямі.

Вельмі важным аспектам грамадскага транспарту з'яўляецца час разгону. А ў электратранспарту ён значна меншы. Гэта важна, калі ўлічыць, што на працягу маршруту толькі ў адным напрамку значыцца 30—40 прыпынкаў, плюс скрыжаванні. Калі машына будзе ісці дынамічна, часавыя страты меншыя.

## ДАДАТКОВА 16 КІЛАМЕТРАЎ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ПАЛОС

З кожным годам у Мінску ўсё больш затораў, яны ўсё даўжэйшыя і шчыльнейшыя. Каб паскорыць рух аўтобусаў і тралейбусаў, некалькі гадоў таму было вырашана выдзяляць палосы для грамадскага транспарту. Але справа ідзе вельмі павольна. Сёння іх працягласць у сталіцы ўсяго толькі каля 30 кіламетраў. Пры гэтым, паводле слоў Валерыя Шкуратава, агульная даўжыня маршрутаў больш за чатыры тысячы кіламетраў.

**«Праект стварэння сістэмы прыярытэту руху грамадскага транспарту ўключаны ў інвестыцыйную праграму развіцця Мінска».**

«На 2022 год, калі знойдуцца фінансавыя рэсурсы пад гэтыя мэты, будзе ўладкавана яшчэ 16 кіламетраў выдзеленых палос. У першую чаргу мы разглядаем участак па вуліцы Багдановіча (ад вуліц Янкі Купалы да Някрасава), у другую — Ігуменскі тракт, дзе плануем істотна ўзняць хуткасць дастаўкі пасажыраў, вуліцы Маякоўскага і Свярдлова.

Таксама разглядаецца частка вуліцы Ташкенцкай, не здымаем з парадку дня і ўчасткі на вуліцах Сталетава і Раманаўская Слабада, дзе пастаянна ўзнікаюць заторы і пробкі. Калі мы сумесна з ДАІ зможам абгрунтаваць выдзяленне паласы, то там яна і з'явіцца. Праект стварэння сістэмы прыярытэту руху грамадскага транспарту ўключаны ў інвестыцыйную праграму развіцця Мінска», — расказаў гендырэктар «Сталічнага транспарту і сувязі».

Нагадаем, выдзеленыя палосы для руху грамадскага транспарту з'явіліся ў Мінску напярэдадні II Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе. З тых часоў іх працягласць пастаянна павялічваецца. Пры гэтым правілы дарожнага руху забараняюць аўтамабілям заязджаць на гэтыя палосы, акрамя выпадкаў, калі неабходна павярнуць налева, забраць або высадзіць пасажыра. Парушэнне пагражае штрафам у памеры 1—5 базавых велічынь.

## ПАТРЭБНЫЯ ВІДЭАКАМЕРЫ НА ДАРОГАХ

Захаванне графіка руху сёння — галоўная праблема для сталічных транспартнікаў, лічыць **намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс» Віктар ТОЗІК**.

Па словах эксперта, улічваючы складаную эпідэміялагічную абстаноўку, прадпрыемства працуе стабільна. «Нягледзячы на тое, што ў пэўныя перыяды вялікая колькасць кіроўцаў аўтобусаў, тралейбусаў і трамваяў знаходзілася на бальнічных, мы не сарвалі перавозкі ў Мінску ні на адзін дзень», — дадаў спецыяліст.

Сёння на балансе «Мінсктранса» дзесяць транспартных прадпрыемстваў: пяць — аўтобусных, чатыры — тралейбусных і адзін трамвайны парк. Таксама прадпрыемства займаецца прыгараднымі перавозкамі. Усяго існуе 430 маршрутаў розных напрамкаў, якія абслугоўвае гэта аб'яднанне.

«У недалёкай будучыні, калі ўсталююць відэакамеры і кожнаму парушальніку будуць прыходзіць «пісьмы шчасця», нам стане лягчэй. Будучыня мегаполісаў, вядома ж, за грамадскім транспартам, таму што ён наносіць меншую шкоду экалогіі гарадоў. І калі мы сёння забяспечым захаванне графіка руху на ўсім працягу маршруту, вядома ж, пасажыр аддасць перавагу грамадскаму транспарту», — удакладніў прадстаўнік «Мінсктранса».

## ПРЫГАРАДНЫЯ МАРШРУТЫ НЕ СКАРАЦІЛІСЯ?

Адказваючы на пытанні журналістаў аб скарачэнні прыгарадных маршрутаў і рэзкім памяншэнні колькасці рэйсаў летам мінулага года, Віктар Тозік заявіў, што колькасць прыгарадных маршрутаў «у цэлым не скарацілася». «Проста сёння заказчыкам на выкананне прыгарадных перавозак з'яўляюцца два аператыры — «Сталічны транспарт і сувязь» і «Мінаблпасажыртранс», якому перадалі частку нашых маршрутаў. Так што колькасць іх не зменшылася, проста змянілася якасць паслуг, бо ў абласных транспартнікаў горшыя аўтобусы. Справа ў тым, што «Мінсктранс» у 2019 годзе да Еўрапейскіх гульняў атрымаў добрыя машыны — МАЗ-203/165, прыгарадны варыянт. Можа быць, і колькасць маршрутаў, рэйсаў зменшылася, бо ў «Мінаблпасажыртранса» не такія вялікі парк і не такія ёмістыя аўтобусы», — заявіў Віктар Тозік.

«Трамвай — вельмі перспектыўны від транспарту, але толькі калі ён рухаецца па адасобленай трасе. Калі ж ён «завязаны» сярод астатняга транспарту ў актыўнай частцы горада, то стварае мноства праблем, як каля плошчы Якуба Коласа», — сказаў намеснік генеральнага дырэктара ДП «Мінсктранс».

## «ШТАДЛЕРАЎСКІЯ» ЭЛЕКТРЫЧКІ — ПАКУЛЬ ПЕРСПЕКТЫВА

Калі сталічныя транспартнікі сёння робяць стаўку на развіццё электратранспарту, то на чыгунцы апошнія гады развіваюць тэму хуткасных электрычак, якія звязалі Мінск з абласнымі цэнтрамі.

«Гэта запатрабаваны сегмент перавозак, сярэдні час у шляху паміж Мінскам і абласнымі цэнтрамі складае ад 2 гадзін 50 хвілін да 3 гадзін 30 хвілін, у залежнасці ад рэжыму руху. Бо мы павінны ўлічваць і інтарэсы жыхароў райцэнтраў па шляху руху», — заявіў **начальнік аддзела арганізацыі пасажырскіх перавозак Беларускай чыгункі Канстанцін БАЯР**.

Спецыяліст таксама адзначыў, што нашы электрычкі ад швейцарскага вытворцы далёка не складаюць аснову чыгуначнага парка. На маршруты штодня выходзіць 272 пары звычайных электрычак, 36 — гарадскіх ліній і толькі 23 пары прыпадае на хуткасную сувязь паміж сталіцай і абласнымі цэнтрамі, яшчэ 10 пар сучасных электрычак — па абласцях.

## НАГРУЗКА НА ПАСАЖЫРА ПАВІННА БЫЦЬ ЗБАЛАНСАВАНАЯ

Таксама Канстанцін Баяр адзначыў, што ў перыяд пандэміі пасажырскія перавозкі чыгуначным транспартам у значнай меры страцілі ў акупнасці. Рэнтабельнасць упала ў разы, але... «Тарыфная палітыка — гэта сацыяльны момант, нагрузка на пасажыра павінна быць збалансаваная. Тарыфы ўстанаўлівае міністэрства, і яны павінны быць збалансаваныя ў цэлым па транспартнай сістэме: павышэнне або паніжэнне кошту праезду павінна быць увязана па транспартнай сетцы. Змены будуць. Чыгунка не з'яўляецца чымсьці асаблівым у агульнай транспартнай сістэме, і калі ў аўтаперавозках ёсць павелічэнне кошту праезду, то магчымае яно і на чыгунцы», — сказаў Канстанцін Баяр.

Як вядома, з першых дзён красавіка штогод уводзілася льгота для пенсіянераў — так званы дачны тарыф у 50 % ад кошту праезду прыгараднымі цягнікамі. Цікава, а ці будуць і сёлета пенсіянеры ездзіць за паўцаны? Прадстаўнік чыгункі адзначыў, што рашэнне такіх пытанняў прымаецца на іншым узроўні. «Калі яно будзе прынята, то мы яго выканаем».

**Сяргей КУРКАЧ.**

Прэм'ера рубрыкі: «Сямейныя гісторыі»

# СКАРБ СА СТАРОГА ЧАМАДАНА

## Марына Кальчыба атрымала ў спадчыну ад бабулі ўнікальныя сшыткі з псальмамі стагадовай даўніны

**Знаёмцеся, прэм'ера рубрыкі. Чужыя сямейныя гісторыі карысныя перш за ўсё тым, што прымушаюць успомніць свае асабістыя. А ў Год гістарычнай памяці добра было б гэта зрабіць. Наша сённяшняя гераіня магла б з лёгкасцю расказаць іх нават не адну. Апошнія некалькі гадоў яна захапілася пошукамі сваіх далёкіх каранёў. Скептыкі скажуць: а дзе іх шукаць, калі ўжо і сведкаў не засталося? Марына, калі пачала даведвацца пра свайго зніклага без вестак дзеда, неверагодным чынам знайшла не толькі поўную інфармацыю пра яго, але нават і магілу. Пра гэтую незвычайную гісторыю мы ўжо пісалі. А сённяшняя нават не ўмяшчаецца ў сямейных рамках. Яна адкрывае не зусім вядомыя старонкі з жыцця нашых веруючых продкаў у савецкі перыяд, калі рэлігія не віталася. У спадчыну ад бабулі Матроны Марыне засталіся сшыткі з напісанымі ад рукі малітоўнымі песнямі — псальмамі, у якіх людзі славяць Багародзіцу і Хрыста. Маладая жанчына прызнаецца, што для яе гэта самы сапраўдны скарб.**



### МАТРОНА РОГАВА

Менавіта так звалі бабулю Марыны. Захаваўся здымак ваеннага перыяду, дзе яна, яшчэ даволі маладая жанчына, пазіруе разам з сяброўкамі невядомаму фатографу. Уважлівы, спакойны погляд, строгі пінжак, складзеныя на спадніцы рукі. Да рэвалюцыі яна вучылася ў гімназіі, добра валодала некалькімі замежнымі мовамі. Падчас Вялікай Айчыннай вайны трапіла ў нямецкае рабства, некалькі гадоў правяла ў лагеры. Яна пражыла крыху болей чым 90 гадоў і ўсё жыццё цалкам прысвяціла Богу. Яе вера была ціхая і недакучлівая. Марына кажа, што заўсёды з задавальненнем гасціла ў яе ў вёсцы Бардзінічы Чавускага раёна.

— Мне было 13 гадоў, калі яе не стала, — успамінае Марына. — І я вельмі смуткавала па бабулі. Яна заўсёды была роўная і добразычлівая, нікога ні да чога не прымушала, у тым ліку верыць у Бога. Яна ніколі не парушала пост, але, калі ў такі час родныя збіраліся ў яе за сталом, падавала стравы і посныя, і скаромныя. Некаторыя яе знаёмыя, таксама вернікі, папракалі яе за гэта, але яна казала: зараз іншы час, не чапайце нікога. Маці мне тлумачыла, што сапраўдны вернік нікога прымушаць верыць у Бога не стане, чалавек павінен сам прыходзіць да веры. Гасподзь кліча кожнага па-свойму.

У памяці ўнучкі засталося, як бабуля Матрона часта і доўга малілася на каленках перад самаробнай лампадкай. Яна таксама дасталася Марыне ў спадчыну — просценькая, зробленая з алюмініевых лыжак. Жыла Матрона Цімафееўна ціха, у малітвах, і памерла лёгка: заснула і не прачнулася.

### ТАЙНЫЯ СЁСТРЫ

Шмат вядома пра тое, што ў савецкі перыяд хадзіць у храмы не віталася, але мы амаль нічога не ведаем пра тое, як просты народ гэтую веру захоўваў. Сыходзіць тое пакаленне, якое магло б яшчэ нешта расказаць, як людзі маліліся дома, адкуль браліся тыя іконы ў тонкіх фальгавых акладах, так званыя падакладніцы. Яны і зараз яшчэ вісяць у некаторых сялянскіх хатах.

— Мая бабуля мела перапіску з тайным манастыром Магілёва, — інтрыгуе Марына. — Я знайшла сярод яе сшыткаў лісты, якія так і пачынаюцца: умілаваныя сёстры ў Хрысце. Дасведчаныя людзі падказалі, што гэты манастыр знаходзіўся ў раёне Барысаглебскай царквы ў Магілёве. Разам з імі спрабавалі адшукаць тое загадкавае месца, але знайшлі толькі руіны. Суседзі расказалі, што там сапраўды жылі свяшчэннік і дзве манашкі. Яшчэ некалькі манашак жылі на Лупалава і ў некаторых іншых месцах Магілёва. Яны маліліся дома, таму што пасля рэвалюцыі з'явіліся свяшчэннікі, якія служылі савецкай уладзе і ўсіх здавалі, — іх звалі абнаўленцамі. Тады шмат хто адвярнуўся ад храма, з'явіліся так званыя катакомбныя цэрквы. Мая бабуля таксама малілася дома, з такімі ж, як і яна, вернікамі хадзіла ў паломніцтва ў Кіева-Пячэрскую і Пачаеўскую лаўры. Яны называлі сябе сапраўды праваслаўнымі.



### ТАЯМНІЧЫЯ СШЫТКІ

Скарб ад бабулі трапіў да Марыны ўжо пасля смерці цёткі, якая жыла разам з бабуляй. У каморы старога бабулінага дома яна знайшла чамадан, даверху набіты яшчэ дарэвалюцыйнымі выданнямі пра жыцці святых і перапісанымі ад рукі акафістамі. Марына нават не звярнула ўвагі на сшыткі з псальмамі. Але, як кажуць, Бог зганьбаваны не бывае. Прыйшоў час, калі сшыткі самі нагадалі пра сябе.

— У вёсцы, дзе жыла бабуля, шмат хто пытаўся ў мяне пра сшыткі з царкоўнымі песнямі, — кажа Марына. — Я ж і ўцяміць не магла, пра што ідзе гаворка. А некалькі гадоў таму вырашыла перабраць бабулін чамадан, адкрыла яго і ахнула: ну вось жа тыя сшыткі, пра якія ўсе пыталіся. Стала распытваць маці, што гэта і адкуль. Яна расказала, што вельмі даўно гэтыя сшыткі перадала бабулі яе выпадковая знаёмая, тайная манашка. Дарэчы, свяшчэннапакутніку Паўліну Крошачкіну, архіепіскапу Магілёўскаму, які быў рэпрэсіраваны ў 1937-м, у асабістай справе таксама ставілі ў віну такія сшыткі з рэлігійнымі песнямі і ўлёткамі. За гэта ў савецкі час маглі арыштаваць.

У чамадане акрамя духоўнай літаратуры Марына знайшла каля 40 рукапісных акафістаў, перапісаную ад рукі Пасхалію, служэбнік свяшчэнніка з іржавым жалезным пераплётам. Знаёмы бацюшка патлумачыў ёй, што такімі карысталіся менавіта палкавыя свяшчэннікі, каб куля не сапсавала пераплёт. Ёсць кнігі з дарчымі надпісамі. Напрыклад, «закончыўшаму курсы Бардзініцкага земскага вучылішча Марку Чэсакову» — Марыніна-му сваяку або «хрысціяніну вёскі Бардзінічы 1904 года».

### АДНОЎЛЕНЫЯ ПСАЛЬМЫ

Нядаўна ў прыватным магілёўскім выдавецтве «Амелія-прынт» выйшла кніга з Марынінымі псальмамі. Ідэя аб яе стварэнні ўзнікла менавіта пасля таго, як яна падзялілася сваёй знаходкай з іншымі. Высветлілася, што падобных выданняў пасля рэвалюцыі не было. Дзякуючы Марыне адноўлена і рэдкая кніга з псальмамі Уладзіміра Мусатава, якая таксама трапіла да яе ад бабулі. Але знайшлася яна не адразу, гаспадыня яе хавала ў сваёй хаце за шпалерамі. Кніга, на жаль, захавалася не цалкам, была вельмі пашарпаная з выразанымі літаграфіямі, але выдавецтва змагло яе аднавіць.

— Праз архіў маскоўскіх бібліятэк нам выслалі літаграфіі, а тэксты мы знайшлі ў Мінскай нацыянальнай бібліятэцы, — удакладніў дырэктар выдавецтва Аляксандр Емяльянаў. — Усё гэта скампілявалі і аднавілі кнігу, якая выдавалася ў 1908 годзе. Яе аўтар Уладзімір Мусатаў збіраў песнапенні па манастырах Расіі, аб'ехаў шмат святых месцаў. Яны былі настолькі папулярныя, што кніга 14 разоў перавыдавалася. Гэта манаская песнапенні. А вось тыя сшыткі, якія трапілі да Марыны Кальчыбы ад бабулі — з народнымі псальмамі. Іх, як правіла, спявалі падчас царкоўных свят, на пахаваннях, пры хрышчэнні — з усякай нагоды. Усе жыццёва важныя моманты асвятляліся ў гэтых песнапеннях: Ушэсце, Прачыстая, Пакроў і гэтак далей. Царкоўныя святы вельмі шанаваліся сярод сялян, і яны славілі Бога. Прычым у кожным куточку краіны былі свае інтэрпрэтацыі. У словах адлюстроўваўся мясцовы каларыт. Сшыткі Марынінай бабулі далі нам магчымасць уявіць, якія духоўныя песні спявалі на Магілёўшчыне.

У Магілёве нават паклапаціліся аднавіць мatыў, на які яны спяваліся. Зрабіць гэта дапамагла намеснік дырэктара Духоўна-асветніцкага цэнтра Георгія Каніскага Тaццяна Барысенка разам з выкладчыкамі Магілёўскага каледжа мастацтваў. Відэаролік, дзе музыканты спяваюць псальмы, размешчаны на YouTube.

— Калі я на Вялікдзень прыехала ў бабуліну вёску і паказала кнігу з псальмамі, кожны пажадаў набыць яе для сябе, — усміхаецца Марына. — Людзі дагэтуль памятаюць, як яна спявала псальмы. Бабулю часта запрашалі на пахаванні, народзіны, іншыя знамянальныя для сям'і мерапрыемствы. На жаль, тыраж быў абмежаваны, і кніга хутка разышлася. У яе ўвайшлі не толькі мае псальмы. Калі Магілёўская епархія аб'явіла, што збірае падобныя духоўныя вершы для выдання, шмат хто адгукнуўся. Прысылалі псальмы з усёй Беларусі.

Зараз у Магілёве рыхтуецца перавыданне гэтай кнігі. Яна выйдзе са змяненнямі і дапаўненнямі. «Спадзяюся, што для многіх яна стане сапраўдным падарункам, — кажа суразмоўніца. — Калі я трымала кнігу ў руках, ледзь не плакала ад захаплення. Бо гэта таксама наша спадчына і гістарычная памяць».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Марыны КАЛЬЧЫБЫ.**

# «Дадому!»: на выставе ў Віцебску паказалі ўнікальныя здымкі вяртання воінаў-афганцаў

**Галоўным акцэнтам выставы «Дадому!», прысвечанай 33-годдзю вываду Абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў з Афганістана, якая працуе зараз у Віцебску, стала вяртанне воінаў-інтэрнацыяналістаў з Афганскай вайны, паведаміла карэспандэнту БелТА галоўны захавальнік Віцебскага музея воінаў-інтэрнацыяналістаў Вікторыя ХАРКЕВІЧ.**

Урыўкі лістоў, якія звязвалі служачых у далёкай азіяцкай краіне з роднымі, блізкімі, домам, на адкрыцці выставы гучалі на розныя галасы. Аб чым тады думалі хлопцы, якія адправіліся выконваць міжнародны абавязак? Адзін абяцаў служыць з гонарам і доблесна выконваць баявыя задачы. Другі чакаў, што вось-вось прыедзе назад на радзіму, і прасіў блізкіх крыху пачакаць. А трэці хацеў хутчэй зведаць смак бабулінага малінавага варэння і маладой бульбачкі, водар квітнеючых лугоў, прайсціся па любым сэрцу лесе, каб забыць абрыдлыя горы і пыл...



**Старшы навуковы супрацоўнік музея воінаў-інтэрнацыяналістаў Алена СКУГАРЭЎСКАЯ** расказала аб графічных работах мастака Леаніда Шакінкі, прадстаўленых у цэлай серыі пад назвай «Афганістан — боль мой». «Леанід Шакінка пачаў ствараць гэту серыю, калі яшчэ ішла вайна ў Афганістане, першыя работы стварыліся ў 1988 годзе. Галоўны вобраз карцін — савецкі салдат. Аўтар сам перажыў Вялікую Айчынную вайну і ведаў, што адчувае ваеннаслужачы ў час узброенага канфлікту. Мастак паказаў таксама адваротны бок вайны — боль не толькі савецкай, але і афганскай маці, што для такіх твораў стала наватарствам», — расказала яна.

Прадстаўленую на выставе фотахроніку па часцінках сабралі супрацоўнікі музея воінаў-інтэрнацыяналістаў і музея сучаснага мастацтва. Чорна-белыя і каляровыя здымкі суправаджаюцца тэкстамі — тлумачэннямі аб жыцці, побыце і баявых задачах салдат у Афганістане. Як ішлі ў разведку, праводзілі размініраванне, калі і дзе ішлі асабліва бязлітасныя баі, за што маджахеды атрымлівалі знакі ўзнагароды і самыя вялікія ўзнагароджанні, якія ўдзельнікі былі самымі небяспечнымі для ваенных калон... На гэтыя і іншыя факты сучасны глядач глядзіць зусім іншымі вачыма, а воіны-афганцы адчуваюць хваляванне ад кожнага слова, успамінаючы бясконцую стральбу і загінулых таварышаў.

Адзін з важных аб'ектаў выставы — падборка ўнікальных фотаздымкаў у дзень вяртання віцебскіх дэсантнікаў у родны горад 11 сакавіка 1989 года. На сустрэчу воінаў-інтэрнацыяналістаў 103-й гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі выйшаў вялізны натоўп жыхароў. Радасць ад вяртання дадому і надзея на новае мірнае жыццё чытаецца на тварах ваеннаслужачых.

«Віцебск як ніякі іншы горад нашай вобласці закранула тэма Афганскай вайны. Адсюль дэсантнікі адпраўляліся на вайну, разумеючы, што могуць не вярнуцца. Боль і страты віцябчан, якія не дачакаліся сваіх мужоў, сыноў, братоў, лепшых сяброў, не сціхае дагэтуль. Для іх было важна, каб усе воіны вярнуліся дадому цэлымі і здаровымі. На жаль, вобласць страціла 160 сваіх сыноў на той вайне. Сёння наш абавязак — помніць пра іх, не аддаваць забыццю і не скажаць праўду пра іх подзвігі», — падкрэсліў **старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Валяр'ян МАЦКЕВІЧ.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ЗОЛОТО НЕ ЗА ГОРАМИ!»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Золото не за горами!» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Золото не за горами!» (далее – Рекламная игра).

**1. Организатор Рекламной игры.**

Организатором Рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», УНП 190771520, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 2 ноября 2006 года, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190771520.

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18б, 2-й этаж, пом. 5.

Почтовый адрес: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, 21/5, оф. 153.

**2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.**

Заинтересованным лицом Рекламной игры является закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский Банк «БСБ Банк», 220004, пр-т Победителей, дом 23, корпус 4, УНП 807000069.

**3. Участники Рекламной игры.**

К участию в Рекламной игре приглашаются физические лица, держатели банковских платежных карточек платежной системы Visa, эмитированных закрытым акционерным обществом «Белорусско-Швейцарский Банк «БСБ Банк» (далее – «Банк»), достигшие возраста 18 лет: граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь.

Участниками Рекламной игры не могут быть лица, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства; лица, состоящие в трудовых отношениях с Банком, а также Члены комиссии по проведению Рекламной игры.

**4. Наименование Рекламной игры: «Золото не за горами!»**

**5. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**6. Срок начала Рекламной игры:** 1 марта 2022 года.

**7. Срок окончания Рекламной игры:** 30 июня 2022 года.

**8. Наименование товаров (работ, услуг), в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования безналичных расчетов физическими лицами с использованием банковских платежных карточек международной платежной системы Visa, эмитированных Банком (далее – «Карточка»).

**8.1.** При использовании в Правилах термин **«карточка»** используется в значении, определенном статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

**9. Призовой фонд Рекламной игры.**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств и имущества Заинтересованного лица в размере **56 965,91 (пятьдесят шесть тысяч девятьсот шестьдесят пять) белорусских рублей 91 копейка.** Призовой фонд рекламной игры включает следующие призы:

**Таблица № 1. Призовой фонд рекламной игры**

| № | Наименование | Далее в правилах | Кол-во, шт. | Стоимость за ед., бел. рублей | Всего, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Золотой мерный слиток 20г A20608 | Приз 1 | 1 | 3010,00 | 3435,71 |
| | Денежные средства | | | 425,71 | |
| 2 | Золотой мерный слиток 20г A20609 | Приз 2 | 1 | 3010,00 | 3435,71 |
| | Денежные средства | | | 425,71 | |
| 3 | Золотой мерный слиток 20г A20610 | Приз 3 | 1 | 3010,00 | 3435,71 |
| | Денежные средства | | | 425,71 | |
| 4 | Золотой мерный слиток 20г A20696 | Приз 4 | 1 | 3010,00 | 3435,71 |
| | Денежные средства | | | 425,71 | |
| 5 | Золотой мерный слиток 250г A02953 | Главный приз | 1 | 37 625,00 | 43 223,07 |
| | Денежные средства | | | 5598,07 | |
| **ИТОГО** | | | | | **56 965,91** |

**10. Порядок участия в Рекламной игре.**

**10.1.** Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 01.03.2022 по 30.04.2022 включительно (далее – «Период участия»):

**10.1.1.** Являться или стать держателем Карточки;

**10.1.2.** Зарегистрироваться на интернет-сайте igra.bsb.by (далее – «Сайт»), заполнив регистрационную форму на русском/белорусском языке, содержащую следующие персональные данные:

- фамилию (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, при наличии) держателя Карточки;
- дату рождения держателя Карточки (обязательно);
- номер мобильного телефона белорусского мобильного оператора держателя Карточки в формате «+375XXXXXXXXX» (обязательно);
- адрес электронной почты держателя Карточки (обязательно);
- первые 6 цифр номера Карточки (обязательно);
- последние 4 цифры номера Карточки (обязательно).

Также Участнику необходимо подтвердить согласие на участие в Рекламной игре, ознакомление с настоящими Правилами, а также подтвердить согласие на обработку своих персональных данных и информации, составляющей банковскую тайну, на Сайте, путем проставления соответствующей галочки при заполнении регистрационной формы.

**10.1.3.** С соблюдением правил пользования Карточкой, совершить одну или несколько безналичных операций, каждая на сумму не менее 50,00 (пятидесяти) белорусских рублей, по оплате товаров/работ/услуг на территории Республики Беларусь, за исключением операций, указанных в п.10.5 Правил.

**10.2.** Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное число раз, совершая новые безналичные операции согласно п. 10.1.3 настоящих Правил.

В Рекламной игре принимают участие безналичные операции Участника, совершенные после регистрации Участника на Сайте, а также отраженные по банковскому счету Участника, в соответствии с Таблицей № 2 п.11.1 настоящих Правил.

**10.3.** Каждая уникальная безналичная операция на сумму не менее 50,00 (пятидесяти) белорусских рублей, совершенная в соответствии с настоящими Правилами, участвует в розыгрыше призов, согласно порядку проведения розыгрышей (Таблица № 2 п.11.1 настоящих Правил).

**10.4.** Участнику присваивается один Номер участника для розыгрыша призов за каждые 50,00 (пятьдесят) белорусских рублей безналичной операции, соответствующей п. 10.1.3 настоящих Правил, и совершенной с 01.03.2022 по 30.04.2022, согласно периодам участия, указанным в Таблице № 2 п. 11.1 настоящих Правил. То есть Участнику, совершившему безналичную операцию на сумму 100,00 (сто) белорусских рублей, будет присвоено 2 (два) Номера Участника для розыгрыша призов.

**10.4.1.** В розыгрыше Главного приза участвуют все безналичные операции, совершенные Участниками в соответствии с настоящими Правилами, а также отраженные по банковскому счету Участника.

**10.5.** Не являются основанием для участия в Рекламной игре:

- безналичные операции, совершенные до и после Периода участия;
- безналичные операции на сумму меньше 50,00 (пятидесяти) белорусских рублей;
- безналичные операции, совершенные в системе ЕРИП;
- операции по пополнению банковского счета;
- операции, совершенные посредством мобильного и интернет-банкинга;
- операции по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку;
- операции по оплате услуг мобильных операторов;
- безналичные операции, которые были отменены и/или по которым были возвращены деньги на Карточку;
- выдача наличных денежных средств в АТМ (банкомат) и ПВН (пункт выдачи наличных);
- операции в казино и иных игорных заведениях, оплата ставок и пари, в том числе через Интернет;
- оплата комиссионных вознаграждений банкам, погашение кредитов через кассы, устройства самообслуживания;
- безналичные операции по оплате товаров/работ/услуг в иностранных организациях торговли и сервиса (например, иностранные интернет-магазины).

**10.6.** Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенных безналичных операций Участниками Рекламной игры, в том числе обратиться к Заинтересованному лицу в целях проверки безналичных операций, участвующих в Рекламной игре.

**10.7.** Организатор не несет ответственности за ошибки, допущенные Участником при заполнении персональных данных при регистрации на Сайте.

**11. Место, даты, время и порядок проведения розыгрышей призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры:**

Розыгрыши призов проходят по адресу: Республика Беларусь, город Минск, пр. Победителей, д. 23, корп. 4 (головной офис «БСБ-Банк») в соответствии с датами и временем, указанными в Таблице 2.

Розыгрыши призов проводятся открыто, с возможностью присутствия Участников Рекламной игры.

**11.1. Розыгрыши призов проводятся согласно следующему графику:**

**Таблица № 2. Розыгрыши призов:**

| Номер розыгрыша | Дата и время розыгрыша | Период регистрации Участника на Сайте | Период совершения безналичной операции | Период отражения безналичной операции по счету Участника | Призы для розыгрыша |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 29.03.2022 14:00 | с 01.03.2022 по 13.03.2022 | с 01.03.2022 по 13.03.2022 | с 01.03.2022 по 21.03.2022 | Приз 1 – 1 шт. |
| 2 | 12.04.2022 14:00 | с 01.03.2022 по 27.03.2022 | с 14.03.2022 по 27.03.2022 | с 14.03.2022 по 04.04.2022 | Приз 2 – 1 шт. |
| 3 | 26.04.2022 14:00 | с 01.03.2022 по 10.04.2022 | с 28.03.2022 по 10.04.2022 | с 28.03.2022 по 18.04.2022 | Приз 3 – 1 шт. |
| 4 | 17.05.2022 14:00 | с 01.03.2022 по 30.04.2022 | с 11.04.2022 по 30.04.2022 | с 11.04.2022 по 10.05.2022 | Приз 4 – 1 шт. |
| | | | с 01.03.2022 по 30.04.2022 | с 01.03.2022 по 10.05.2022 | Главный приз – 1 шт. |

**11.2.** Для осуществления каждого розыгрыша призов формируется Список, в котором за каждые 50,00 (пятьдесят) белорусских рублей безналичных операций, соответствующих Правилам, присваивает Номера Участника для розыгрыша призов в хронологическом порядке согласно дате и времени совершения безналичной операции Участником. В случае совпадения у нескольких Участников даты и времени совершения безналичных операций, Номера Участника присваиваются по фамилии, имени и отчеству (при наличии) участника по алфавиту.

Все Номера Участников в каждом розыгрыше призов имеют одинаковую разрядность.

**11.2.1.** Каждый Список для розыгрыша призов содержит следующую информацию: Номер Участника, фамилию, имя, отчество (при наличии) Участника, адрес электронной почты (e-mail), номер телефона Участника, дату и время совершения безналичной операции, дату и время отражения безналичной операции по банковскому счету, сумму безналичной операции, дату регистрации на Сайте.

**11.3.** Для проведения каждого розыгрыша используется лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) до 9 (девяти). Определение выигрышных Номеров Участников происходит путем его формирования слева направо из цифр на шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

**11.3.1.** Для определения цифры первого слева разряда выигрышного Номера Участника в лототрон помещаются шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в Списке. Из лототрона извлекается один шар. Цифра на шаре вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного Номера Участника.

**11.3.2.** После этого в лототрон загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, который определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах Номеров Участников. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного Номера Участника – и шар возвращается в лототрон; в противном случае – извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон, и извлекается следующий шар до получения нужного совпадения.

**11.3.3.** Шары извлекают до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов Номеров Участников в Списке. Таким образом, формируются все выигрышные Номера Участников – Победителей призов.

**11.4.** При проведении каждого розыгрыша дополнительно определяются по одному резервному победителю для каждого приза. Резервным победителем становится следующий за выигрышным по Списку Номер Участника, принадлежащий другому Участнику.

В случае если Номер участника резервного победителя принадлежит основному победителю приза в Рекламной игре, или Участнику, уже ставшему резервным победителем другого приза, то выигрышным становится следующий после него первый Номер участника иного Участника.

**11.5.** Результат каждого Розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе розыгрыша, который подписывается присутствующими на заседании членами комиссии по проведению Рекламной игры.

**12. Порядок уведомления Победителей о результатах розыгрышей, порядок получения выигрышей.**

**12.1.** Организатор в течение трех рабочих дней после проведения розыгрыша уведомляет Победителей о выигрыше посредством направления извещения по электронной почте, указанной Победителями при регистрации на Сайте. Извещения, направленные по электронной почте, считаются полученными Победителями по истечении одного рабочего дня с момента их отправки. Дополнительно Организатор может уведомлять Победителей о выигрыше путем осуществления звонков по номеру мобильного телефона, указанному при регистрации на Сайте.

**12.2.** Для получения призов Победителям, после уведомления о выигрыше, необходимо прибыть в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 21/5, оф.153 не позднее 17.06.2022 по рабочим дням с 10:00 до 18:00 или в субботу 04.06.2022 с 11.00 до 14.00. При себе Победителю необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (паспорт/вид на жительство в Республике Беларусь/удостоверение беженца), для предъявления Организатору и использования данных при оформлении необходимых документов в рамках Рекламной игры. Копии данных документов Организатор оставляет у себя. Организатор, при необходимости, вправе запрашивать предоставление дополнительных подтверждающих документов, необходимых для удостоверения личности Победителя (свидетельство о браке/разводе/смене имени).

**12.3.** Приз не вручается основному Победителю, а вручается резервному победителю в случае, если основной Победитель:

**12.3.1.** отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора;

**12.3.2.** нарушает (не выполняет) условия Правил, в том числе не предоставляет необходимые документы, либо не является за получением приза в сроки и в порядке, установленные пунктом 12.2 Правил;

**12.3.3.** не выходит на связь с Организатором (невозможность получения уведомлений Организатора из-за неактуальных сведений при регистрации на Сайте).

**12.4.** Резервные Победители, которым перешло право на получение приза, уведомляются об этом не позднее 22.06.2022, в порядке, предусмотренном пунктом 12.1 Правил.

Резервные Победители должны выполнить действия, перечисленные в пункте 12.2 Правил, не позднее 30.06.2022. Призы будут выданы резервным Победителям не позднее 30.06.2022.

В случае если резервный Победитель не выполнит действия в обозначенный срок, он утрачивает право на получение приза. Невостребованные призы после окончания Рекламной игры возвращаются Заинтересованному лицу.

**12.5.** Выдача призов представителям Победителей осуществляется по нотариально удостоверенной доверенности.

**12.6.** Призы не подлежат замене. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах.

**12.7.** При получении всех призов победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь, и осуществляется Организатором. Удержание с Победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи призов из денежной части призов (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

**13. Комиссия по проведению Рекламной игры.**

**13.1.** Для контроля за соблюдением официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

1. Канасевич Мария Евгеньевна – начальник департамента маркетинга ЗАО «БСБ Банк»;
2. Бардашевич Анна Михайловна – экономист отдела разработки и развития розничных продуктов департамента розничных операций ЗАО «БСБ Банк»;
3. Шуляк Валерия Сергеевна – маркетолог департамента маркетинга ЗАО «БСБ Банк»;
4. Шорр Полина Андреевна – специалист по работе с клиентами ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ»;
5. Атрашкевич Екатерина Владимировна – специалист по работе с клиентами ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ».

**14. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.**

**14.1.** Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

**14.2.** Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 29.06.2022 включительно.

**14.3.** Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Интернет-сайте igra.bsb.by, а также по телефонам горячей линии: + 375 17 306 20 40, +375 29 306 20 40, +375 44 306 20 40, +375 25 306 20 40 круглосуточно, без выходных.

**15. Прочие условия.**

**15.1.** Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

**15.2.** Участники Рекламной игры, претендующие на получение призов, обязуются предоставить все необходимые документы для получения призов.

**15.3.** Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при его использовании Участником (например, плохое соединение с провайдером и т. д.), а также за работу операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т.д.).

**15.4.** Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

**15.5.** Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

**15.6.** Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по почтовому адресу: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, 21/5, оф.153.

*Свидетельство № 4157 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 21 февраля 2022 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

# ЯДЗЕРНАЯ БЯСПЕКА: ШТОДЗЁННАЯ І ЛІЦЭНЗАВАНАЯ

## Спецыялісты расказалі пра сістэму навуковага забеспячэння радыяцыйнай бяспекі

**Летась Беларусь стала ядзернай дзяржавай, атрымаўшы ліцэнзію (2 чэрвеня 2021-га) на эксплуатацыю першага энергаблока. Гэтаму папярэднічаў доўгі шлях фарміравання інфраструктуры ядзернай і радыяцыйнай бяспекі ў краіне. Цяпер жа спецыялісты знаходзяцца на этапе распрацоўкі закона аб рэгуляванні бяспекі на аб'ектах выкарыстання атамнай энергіі (дакумент павінен трапіць на разгляд у парламент у красавіку). Асобная глава закона — сістэма тэхнічнай падтрымкі як арганізма забеспячэння навуковага суправаджэння рэгулюючай дзейнасці (будзе больш дакладна вызначаны парадак функцыянавання гэтай сістэмы). Мяркуецца таксама заканадаўча замацаваць экспертную суполку ці пул экспертаў, якія атрымалі допускі на выкананне розных работ па ацэнцы і экспертызе бяспекі. А яшчэ — стварыць камісію па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы. Што робіцца ў краіне для навуковага забеспячэння радыяцыйнай бяспекі, расказалі эксперты галіны.**

### КАМПЕТЭНЦЫІ ДЛЯ АБГРУНТАВАНЫХ РАШЭННЯЎ

Сёння ў Беларусі існуе цэласная сістэма, якая ўключае ў сябе 17 арганізацый інфраструктуры ядзернай і радыяцыйнай бяспекі ў краіне. Гэта навукова-даследчыя ўстановы, а таксама ўстановы адукацыі, якія забяспечваюць падрыхтоўку кадраў, адказных за навукова-тэхнічныя экспертныя падыходы да вырашэння разнастайных задач, што ўзнікаюць у працэсе рэгулявання ў галіне ядзернай і радыяцыйнай бяспекі. Акрамя таго, створана каардынуючая арганізацыя — Цэнтр ядзернай і радыяцыйнай бяспекі пры МНС. Яна яшчэ фарміруецца, аднак ужо ўцягнута ў падрыхтоўку розных тэхнічных і экспертных рашэнняў, паведаміла **Вольга ЛУГАЎСКАЯ, начальнік Дзяржатамнагляду:**

— Гаворка не толькі пра ўзвядзенне атамнай станцыі, але і стварэнне інструментаў, механізмаў, нарматыўна-прававых структур, матрыц, якія дазваляюць гарантаваць, што ўсе ўдзельнікі працэсу працуюць належным чынам і бяспечна. Асновы такіх патрабаванняў закладзены ў рэкамендацыях і патрабаваннях МАГАТЭ.

Асноўныя элементы інфраструктуры — найперш рэгулюючыя патрабаванні. Гэта сістэма нарматыўна-прававой базы, арганізацыя ліцэнзійнага працэсу, стварэнне сістэмы нагляду, інспекцыйная дзейнасць, удзел у сістэме аварыйнага рэагавання і аварыйнай гатоўнасці, правядзенне ацэнак і экспертызы бяспекі, выкананне міжнародных абавязкаў, інфармаванне ўсіх зацікаўленых аб стане ядзернай і радыяцыйнай бяспекі. Усе рашэнні, якія прымаюцца ў гэтай сферы, павінны быць навукова абгрунтаванымі і выпрацоўвацца экспертнай суполкай, каб на справе станавіцца аптымальнымі і правільнымі, падкрэсліла начальнік Дзяржатамнагляду:

— На ўсіх этапах рэалізацыі ядзернай праграмы мы абапіраліся на кампетэнцыі спецыялістаў сістэмы тэхпадтрымкі, якая таксама значна эвалюцыянавала. Напачатку цэнтральнай арганізацыяй, якая забяспечвала навукова-тэхнічнае суправаджэнне стварэння БелАЭС, быў Аб'яднаны інстытут энергетычных і ядзерных даследаванняў — Сосны. А паколькі атамная сфера патрабуе высокага ўзроўню кампетэнцый у розных напрамках, паступова фарміраваліся і аб'ядноўваліся ўсе навуковыя і экспертныя рэсурсы для прыняцця пэўных рашэнняў адносна розных аспектаў рэалізацыі ядзернай праграмы.

### ЭКСПЕРТЫЗЫ БЯСПЕКІ І ДАСЛЕДЧЫ РЭАКТАР

Ва ўсіх працэсах у сферы забеспячэння навуковага суправаджэння падчас стварэння БелАЭС (ад першага этапу размяшчэння станцыі і яе стварэння да атрымання ліцэнзіі на эксплуатацыю) удзельнічалі спецыялісты **Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў — Сосны НАН Беларусі**, падкрэсліў яго **генеральны дырэктар Андрэй КУЗЬМІН**. Навукоўцы цесна супрацоўнічаюць з Дэпартаментам па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС, прычым не толькі па праекце атамнай станцыі, але і па ядзерных установках і радыяцыйных аб'ектах, якія эксплуатуе інстытут.

— У нас сфарміраваны дастаткова пул экспертаў, якія маюць вялікі вопыт правядзення экспертыз бяспекі ў галіне выкарыстання атамнай энергіі. Усе спецыялісты прайшлі неабходнае навучанне і павышэнне кваліфікацыі, маюць вялікі вопыт навуковай работы, цесна ўзаемадзейнічаюць з экспертамі з іншых дзяржаў, найперш Расіі. У прыватнасці, з арганізацыяй тэхнічнай падтрымкі «Растэхнагляд» — навукова-тэхнічным цэнтрам па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы, — расказаў Андрэй Кузьмін. — У нас паспяхова завершаны экспертызы на этапах размяшчэння, стварэння і ўводу ў эксплуатацыю першага энергаблока. Цяпер выконваецца экспертыза дакументаў, якія абгрунтоўваюць ядзерную і радыяцыйную бяспеку другога блока.

Наперадзе вялікая работа па навуковым суправаджэнні бяспечнай эксплуатацыі першага і другога энергаблокаў БелАЭС, вырашэнні пытанняў, якія датычацца абарачэння з адпрацаваным ядзерным палівам, радыеактыўнымі адходамі і шэрагу іншых напрамкаў.

Сумесна з расійскім бокам айчынныя навукоўцы працуюць над ідэяй стварэння даследчага ядзернага рэактара і Цэнтра ядзерных навук і тэхналогій на яго базе, нагадаў дырэктар інстытута:

— Каб вы разумелі, гэта не толькі сам рэактар, але яшчэ і пэўныя вытворчыя, навуковыя комплексы, якія спажываюць нейтроны, што выпрацоўваюцца на гэтым даследчым рэактары. Цяпер прапрацоўваецца міжурадавае пагадненне па гэтым пытанні. Работа вядзецца планава ва ўстаноўленым парадку, усе этапы адбываюцца згодна з заканадаўствам.



### ПАРТАЛ ЯДЗЕРНЫХ ВЕДАЎ І ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ

Ліцэнзію на экспертызу бяспекі крыніц радыяцыйнай бяспекі мае Інстытут ядзерных праблем БДУ, які быў створаны ў 1986 годзе. І хоць супадзенне яго з'яўлення з чарнобыльскай катастрофай выпадковае, з першых гадоў установа была ўцягнута ў праграмы па пераадоленні наступстваў здарэння ў частцы распрацоўкі ядзерна-фізічнага, дэзаметрычнага і спектраметрычнага абсталявання. Большая частка спецыялістаў тут — выпускнікі кафедры ядзернай фізікі, расказаў **Аляксандр ЛАБКО, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута ядзерных праблем БДУ**.

**Усе рашэнні, якія прымаюцца ў гэтай сферы, павінны быць навукова абгрунтаванымі і выпрацоўвацца экспертнай суполкай, каб на справе станавіцца аптымальнымі і правільнымі.**

— Хоць усіх цікавіць ядзерная бяспека, звязаная з атамнай станцыяй і іншымі ядзернымі аб'ектамі, аднак мы штодня сустракаемся і з іншымі крыніцамі радыяцыйнай небяспекі, накшталт рэнтгенапаратуры і парталаў дogляду ў аэрапортах ды метро. Уся гэтая апаратура таксама патрабуе экспертызы і знаходзіцца пад кантролем Дзяржатамнагляду. Усе крыніцы ўлічаны і ліцэнзуюцца Дзяржатамнаглядам.

Інстытут забяспечыў Дзяржатамнагляд арыгінальнай распрацоўкай інфармацыйнай сістэмы, дзе сканцэнтраваны ўлік і кантроль баз даных па ліцэнзіі. Дзякуючы ёй можна даведацца, калі мяжу перасякаюць розныя падкантрольныя радыяцыйныя крыніцы. У планах развіваць сістэму надалей, а таксама стварыць сістэму менеджменту (або ўпраўлення) ядзернымі ведамі.

— Гэта важна, бо, па-першае, веды да распаўсюджвання, па-другое, яны (з-за чарнобыльскай катастрофы) па большай частцы сканцэнтраваныя ў Беларусі: радыебіялогія, міграцыя нуклідаў, вопыт па распрацоўцы разнастайнай апаратуры. У нас ёсць што прапанаваць спецыялістам іншых краін, якія займаюцца іанізуючымі выпраменьваннямі і ядзернымі праграмамі, — акрэсліў навуковец. — Стварыць гэта мы мяркуем на базе існуючага партала ўстановы адукацыі па ядзерных ведах — belnet.bsu.by. І праз пару гадоў гэта будзе выглядаць даволі важка, паколькі тэхнічны касцяк у нас ёсць. Важна сабраць веды і напоўніць партал, таму ўсе, хто мае інфармацыю, што стане карыснай для сістэмы ядзерных ведаў, могуць таксама размясціць яе на сайце. Летась, дарэчы, партал наведала каля 150 тысяч карыстальнікаў.

Рыхтуюць і вучаць будучых атамшчыкаў-ядзершчыкаў згодна з дзяржаўнай праграмай падрыхтоўкі кадраў, у якую ўцягнуты БДУ, БНТУ, БДУІР, некаторыя каледжы. Інстытут ядзерных праблем мае дачыненне да фізфака БДУ, дзе навучаюць фізікаў па спецыяльнасцях «Ядзерная фізіка і ядзерныя тэхналогіі» і «Радыяцыйнае матэрыялазнаўства», дадаў Аляксандр Лабко:

— Гэтыя студэнты рыхтуюцца па пашыранай праграме 5,5 года. Туды падбіраюцца добрыя студэнты, якія атрымліваюць сапраўды добрую падрыхтоўку і паказваюць добрыя веды ў дыпломных работах. А нашы кваліфікаваныя супрацоўнікі чытаюць спецкурсы па падрыхтоўцы персаналу для станцыі і ядзерных даследчых установаў. У партнёрскіх ВНУ Расіі нашы студэнты праходзяць нейкія курсы, якія або яшчэ недастаткова распрацаваны ў нас, або няма трэнажораў, што ёсць ва ўніверсітэтах з вялікім вопытам падрыхтоўкі кадраў.

Спецыяліст падкрэсліў, што ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў добры і непакоіцца наконт слабай падрыхтаванасці будучых супрацоўнікаў БелАЭС не варта.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

### ТЫМ ЧАСАМ

**Энергаблок № 1 Беларускай атамнай электрастанцыі з моманту ўключэння ў аб'яднаную энергасістэму краіны выпрацаваў 7,6 млрд кВт•гадз электраэнергіі, паведаміў міністр энергетыкі Беларусі Віктар КАРАНКЕВІЧ.**

У мінулым годзе, 10 чэрвеня, быў падпісаны акт уводу першага энергаблока БелАЭС у прамысловую эксплуатацыю. Цяпер ён працуе на намінальнай магутнасці. З моманту яго ўключэння ў аб'яднаную энергасістэму (3 лістапада 2020 года) выпрацавана 7,6 млрд кВт•гадз электраэнергіі. Гэта дало магчымасць забяспечыць замяшчэнне каля двух млрд куб. м прыроднага газу».

Таксама, як сказаў міністр, у сакавіку на разгляд у Савет Міністраў будзе ўнесены праект указа аб стварэнні нацыянальнага аператара па абыходжанні з радыеактыўнымі адходамі.

Цяпер рыхтуецца праект указа Прэзідэнта аб стварэнні такога нацыянальнага аператара. «Дакумент знаходзіцца на завяршальнай стадыі. Ён практычна прайшоў узгадненне з усімі зацікаўленымі органамі дзяржкіравання. У сакавіку праект указа будзе ўнесены на разгляд ва ўрад», — сказаў Віктар Каранкевіч.

Новая арганізацыя выступіць заказчыкам праектных і пошукавых работ, у тым ліку па аналізе і ацэнцы існуючых на рынку тэхналогій захоўвання і кандыцыянавання радыеактыўных адходаў. Гэтыя работы будуць арганізаваны з удзелам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Нацыянальнай акадэміі навук.

Будзе праведзена комплексная ацэнка магчымых пляцовак для будаўніцтва сховішча радыеактыўных адходаў. Прадугледжваецца, што праект будзе рэалізаваны ў некалькі этапаў. Першую чаргу сховішча плануецца ўвесці ў строй да 2030 года. Паводле слоў міністра, тут будуць захоўвацца радыеактыўныя адходы БелАЭС, прамысловага комплексу, аховы здароўя.

# «МЫ ДАКУМЕНТУЕМ КАНКРЭТНЫ ЧАС, КАНКРЭТНУЮ ПРАСТОРУ»

## Як стваралася «Брама памяці» ў Трасцянцы

**НЯДАЎНА дацэнту кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Канстанціну Касцючэнку была прысуджана Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры за выбітны творчы праект. Пабачыць работу даваялося многім беларусам — гэта скульптурная кампазіцыя «Брама памяці», якая ўсталявана ў мемарыяльным комплексе «Трасцянец». Праца над «Брамай памяці» ішла больш за сем гадоў — з 2007 да 2015. За гэты час Канстанцін Касцючэнка даследаваў архівы, разглядаў гістарычныя здымкі, наведваў замежныя мемарыяльныя комплексы... У выніку праца дала свой плён — праект адзначылі на высокім дзяржаўным узроўні.**



Са скульптарам мы сустрэліся ў яго майстэрні, што знаходзіцца побач з Траецкім прадмесцем. На дзвярах — папера з раскладам заняткаў у Акадэміі мастацтваў, на стале ляжыць кніга Андрэ Банара «Грэчаская цывілізацыя», а побач з ідэальцамі — мастацкія пэндзлі. Гэта ўсё дэталі, але дзякуючы ім ствараецца вобраз гаспадара памяшкання. У сваёй майстэрні скульптар праводзіць палову дня, прыходзіць сюды адразу пасля таго, як заканчваюцца заняткі ў акадэміі.

— У гэтым доме размясціліся старыя творчыя майстэрні, напрыклад, у суседняй працуюць мастакі-манументалісты, — распавядае майстар. — Раней адна з майстэрань побач належала скульптару Уладзіміру Жбанаву, там ён стварыў свае першыя работы. Наглядзячы на кампактныя памеры, у будынку адчуваецца дух часу, гэта намоленае месца. Мне шмат разоў прапаноўвалі пераехаць у майстэрню большых памераў, але я адмаўляўся, таму што за 12 гадоў прызвычаіўся да гэтага месца. Сама майстэрня дапамагае ў працэсе стварэння работ.

***— Як сумяшчаеце творчасць з выкладчыцкай дзейнасцю?***

— Усе педагогі, якія выкладаюць у Акадэміі мастацтваў, прытрымліваюцца традыцыі перадачы сваіх ведаў новым пакаленням. Я ў свой час атрымаў ад старэйшых калег пэўны зарад энергіі, а зараз імкнуся дзяліцца вопытам з моладдзю. У нас невялікая кафедра, працуе ўсяго некалькі чалавек. Тым не менш кожны з педагогаў — практыкуючы скульптар. Пасля заняткаў мы разыходзімся па сваіх майстэрнях, дзе займаемся або эскізамі, або рыхтуем вялікія праекты.

***— Нельга не абмінуць тэму атрымання прэміі. Якія эмоцыі вы адчулі, калі зразумелі, што сталі лаўрэатам?***

— Гэта адна з галоўных прэмій нашай краіны. Таму атрымаць яе — вельмі ганарова і адказна. Ты разумееш, што атрымліваеш яе разам з урачамі-анколагамі, якія ратуюць чалавечае жыццё. Значыць, твой праект, усе тыя намаганні, што ты прыклаў, не былі дарэмныя. Ты робіш выснову, што твае творчыя пошукі і адкрыцці камусьці патрэбныя, прыносяць вынік.

Кожнае пакаленне рухаецца за кошт той базы, якая была напрацавана іх бацькамі і дзядамі. У маім выпадку імкнуся настройваць сваіх студэнтаў, што тыя творы, якія мы робім, ствараюць пэўны ўзровень культуры. Менавіта па іх наступныя пакаленні будуць меркаваць аб узроўні развіцця нашага грамадства. Як і мы цяпер, аналізуючы захаваныя помнікі, выбудоўваем здагадкі аб тым, якой была, напрыклад, Старажытная Грэцыя.

***— Ці стала для вас прэмія пэўным прафесійным і творчым штуршком?***

— Ведаеце, гэта нават не штуршок, а стымул. Праца скульптара шмат у чым параўнальная з працай вучонага. І мастак, і вучоны шмат у чым рызыкуюць. Бо не ўсе праекты, якія мы вядзём, атрымліваюць далейшае развіццё, рэалізацыю і прызнанне. Таму гэтая прэмія — сур'ёзны стымул для далейшых пошукаў і дасягнення высокіх вынікаў.

***— Раскажыце, калі ласка, аб асноўных этапах работы над «Брамай памяці».***

— Да 2010 года я падрыхтаваў эскіз «Брамы памяці», і на адкрытым рэспубліканскім конкурсе работа была прызнана найлепшай і адабрана для рэалізацыі. Затым я стаў працаваць з інстытутам «Мінскпраект» і майстэрняй Ганны Аксёнавай, галоўнага архітэктара мемарыяльнага комплексу «Трасцянец». Мы распрацоўвалі яго цэнтральную частку для канкрэтнай прывязкі самога помніка да ландшафту. Праектаванне ішло з 2010 да 2015 года, і за апошнія год-паўтара мы павялічылі помнік да 10-метровага памеру. Каля месяца яго манціравалі ў самім комплексе на апорным каркасе на падмурку.

Канцэпцыя скульптуры пераглядалася некалькі разоў. Першапачаткова была ідэя адлюстраваць царскія вароты — гэта галоўная брама іканастаса ў праваслаўным храме, якая вядзе ў алтарную частку і ўвасабляе браму раю. Аднак у «Трасцянцы» загінулі прадстаўнікі розных народаў і канфесій, і ў выніку было вырашана зрабіць скульптуру больш усеабдымнай, каб яна закранала зразумелыя для ўсіх агульначалавечыя каштоўнасці. У чымсьці засталася першапачатковая ідэя — адлюстраваць святых, бязвінна забітых людзей. У кожнага з персанажаў ёсць прататыпы. У тых выявах няма яркіх эмоцый. Я стараўся паказаць увесь боль, жах ад таго, што адбываецца, у максімальна спакойным выглядзе, сканцэнтраваць гэта ў абліччах, адлюстраваных на помніку.

Падчас работы над праектам я прыслухоўваўся да парад і прапаноў, стараўся ўзяць з гэтага найлепшае. Сваім досведам і бачаннем дзяліліся мае настаўнікі Леў Гумілеўскі і Міхаіл Савіцкі. У працэсе абмеркавання рабочай мадэлі дапамагалі сябры мастацкай рады. Была праведзена вялікая работа з архіўнымі звесткамі, супрацоўнічалі ў тым ліку і з Нацыянальнай акадэміяй навук, таксама сачылі за ходам правядзення раскопак на тэрыторыі комплексу.

З дапамогай такіх праектаў, як «Брама памяці», хацелася б звярнуць увагу людзей на тэму Вялікай Айчыннай вайны, захаванне гістарычнай праўды.

***— Нярэдка работа над скульптурнай кампазіцыяй займае некалькі гадоў. Пасля прэзентацыі праекта ці рэфлексуеце ад сваёй работы?***

— Я не думаю, што ёсць такія мастакі, якія на ўсе сто працэнтаў задаволеныя вынікам. Калі работа ўжо ўсталявана, думаю: «А можна было вось тут на пяць сантыметраў пасунуць». Але гэта



бачу толькі я, навошта агучваць гэтыя думкі публіцы? Проста зараз я ведаю, што ў наступнай рабоце трэба будзе звярнуць увагу на пэўныя нюансы, каб дамагчыся большай выразнасці.

Кожны завершаны праект дзеліцца на некалькі этапаў. У першую чаргу гэта арганізацыйная частка, падчас якой кіраўніцтва, што плануе ўсталяванне скульптуры, разважае аб тым, як работа павінна выглядаць. Пасля гэтага аб'яўляецца конкурс — скульптары і архітэктары прадстаўляюць свае праекты. Да апошняга конкурснага дня мы адпрацоўваем новыя хады, узнікаюць свежыя ідэі. Пасля гэтага маштабуецца эскіз — пачынаецца работа ў вялікім памеры. Кожны з гэтых этапаў вельмі напружаны, патрабуе вырашэння розных задач. Напрыклад, на эскізе неабходна знайсці асноўныя аб'ёмы, галоўную ідэю, вобразы, праз якія гэтую ідэю можна будзе выказаць. Далей удакладняем прапорцыі і пачынаем адліваць вялікія формы. Зноў жа, трэба старацца, каб аб'ект не страціў першапачатковую ідэю.

Разумееце, да кожнага праекта, які мы ствараем, ставімся як да свайго дзіцяці. Вельмі балюча ўспрымаем усякія змены, датычныя яго. Таму да самага апошняга моманту, да адкрыцця, да ўваходжання скульптуры ў навакольнае асяроддзе вельмі моцна перажываем. І ўспрымаем яе практычна як частку сябе.

***— Каго вы маеце на ўвазе, кажучы «мы», — вашых памочнікаў ці калег?***

— Я гавару за ўсіх творчых людзей. Мяркую, мы ўсе праходзім прыблізна аднолькавыя этапы: думаем аб сімвалах, алегорыях. Акрамя таго, што мы аўтары, у першую чаргу мы дакументуем канкрэтны час і канкрэтную прастору. Калі паглядзець на карціны эпохі Адраджэння, то па іх можна вывучыць той гістарычны перыяд, культуру, палітычныя ўплывы. У любым выпадку, архітэктар, пісьменнік, танцор, музыкант — гэта рупар сваёй эпохі, тонка настроены інструмент, які перадае нюансы і агульны настрой грамадства.

Для мяне ў першую чаргу важна, каб тыя эмоцыі, якія я ўклаў у работу, перадаліся гледачу.

***— Над якімі праектамі працуеце цяпер?***

— Я дапамагаў сваім калегам працаваць над помнікам Якубу Коласу, які будзе ўсталяваны на яго малой радзіме ў Стоўбцах. Са скульптарам Уладзімірам Піпіным мы выйгралі конкурс на помнік Івану Шамякіну. Таксама з калегамі робім вялікія барэльефы для інтэр'ераў Старога замка ў Гродна. Паралельна займаюся эскізаваннем ідэй і праектаў, на рэалізацыю якіх спадзяюся.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# ...А ТАКСАМА САЛЬВАДОР ДАЛІ

## Саюз мастакоў арганізаваў серыю выставак у Палацы мастацтва

**На працягу двух тыдняў у Палацы мастацтва будзе арганізавана пяць выстаў. Наведвальнікі змогуць азнаёміцца з калекцыяй Саюза мастакоў, якая пачала фарміравацца ў 50-х гадах мінулага стагоддзя. Акрамя гэтага, будзе прадстаўлена экспазіцыя арыгінальнай графікі Сальвадора Далі.**

**Першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ** адзначыла:

— Мы будзем паказваць работы, створаныя ў розныя гістарычныя перыяды. Мне здаецца, што праект беларускай графікі і скульптуры, прадстаўлены на фоне незвычайнага, цікавага Далі, зайграе абсалютна новымі фарбамі. Таму сёння мы прэзентуем феерыю самых розных відаў і формаў выяўленчага мастацтва. Мяркую, што на працягу гэтых двух тыдняў Палац мастацтва ператворыцца ў пляцоўку, дзе кожны з гледачоў знойдзе нешта яскравае.

### «Залатая калекцыя Беларускага саюза мастакоў»

Удзельнікі прэс-канферэнцыі адзначылі, што выстаўка была створана дзеля таго, каб чарговы раз нагадаць аб тых, хто пакінуў яскравы след у гісторыі беларускага мастацтва: Віталь Цвірко, Май Данцыг, Павел Масленікаў і іншыя. У экспазіцыю ўвайшло 36 твораў.

— Аўтарамі прадстаўленых работ з'яўляюцца былыя ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны і прадстаўнікі пасляваеннага пакалення, чыю творчасць немагчыма аддзяліць ад гісторыі нашай краіны, — адзначыла **Кацярына ПІНЧУК, галоўны захавальнік калекцыі Беларускага саюза мастакоў.**

### Пяты, юбілейны, праект «Графіка года — 2021»

Спікеры распавялі, што галоўная падстава для стварэння гэтага праекта — жаданне мастакоў як мага шырока і ярка прадставіць створанае за апошні год. Канцэпцыя выстаўкі — паказваць работы не толькі прафесіяналаў і студэнтаў мастацкіх спецыяльнасцяў, але і аматараў. Куратар праекта, намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў, Андрэй Басалыга адзначыў, што да ўдзелу было пададзена каля 350 работ.

### «SculptFest. Лаўрэаты»

— У гэтым праекце будзе прадстаўлена 12 аўтараў, якія былі адабраны па выніках Рэспубліканскага фестывалю скульптуры Беларускага саюза мастакоў, — расказаў сябар Беларускага саюза мастакоў Іван Арцімовіч. — На выстаўцы вы ўбачыце прадстаўнікоў розных мастацкіх напрамкаў — фігуратыўнага і канцэптуальнага. Нашай мэтай было фарміраванне дванаццаці адасобленых павільёнаў, дзе кожны з аўтараў мог бы зрабіць тое, што яму цікава. Дзякуючы гэтаму наведвальнікі пачуюць голас кожнага з мастакоў паасобку, зразумеюць іх творчае крэда.

### «FEMINA FABULAS»

Назва экспазіцыі перакладаецца як «жаночыя гісторыі»: галоўнай ідэяй куратараў было стварэнне зборнай выявы беларускай жанчыны:

— Гэтая выстава дапамагае жанчынам з вызначэннем іх самасвядомасці, — расказала **куратар праекта, сяброўка Беларускага саюза кінематаграфістаў, Алена ЦАГЕЛЬСКАЯ.** — У экспазіцыі прымаюць удзел 22 мастакі, сярод іх — Зоя Літвінава, Алена Шлегель, Васіль Касцючэнка. Гэты праект цікавы і тым, што ў сусвеце, дзе пануюць сацыяльныя сеткі і кліпавае мысленне, наведвальнікам, каб паглыбіцца ў работу, адчуць яе настрой, трэба будзе зазіраць у вочы жанчын, адлюстраваных на палотнах.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# ПРАФЕСІЯ ПРАДЗЮСАР: ДАВЕРЦЕСЯ ПРАФЕСІЯНАЛАМ!

**Сёння прадзюсар — адна з самых запатрабаваных прафесій у музыцы, кіно, адукацыі, на тэлебачанні і нават у сацыяльных сетках. Чаму? Адказ на гэтае пытанне відавочны. Ёсць людзі-творцы, якія займаюцца стварэннем кантэнту, а ёсць людзі-вытворцы, якія гэтую творчасць арганізоўваюць і прасоўваюць. Калі кожны займаецца сваёй справай, атрымліваецца выдатны вынік, які прыносіць задавальненне не толькі маральнае, але і матэрыяльнае.**

**Мая суразмоўніца Алеся КУЗНЯЦОВА — генеральны дырэктар прадзюсарскага цэнтра «Залатыя галасы», якая працуе прадзюсарам ужо 17 гадоў. Здаецца, гэта прафесія была наканавана ёй лёсам. Але, каб дасягнуць высокага ўзроўню, спатрэбілася шмат гадоў сур'ёзнай работы, якая працягваецца і сёння.**



***— Калі і з чаго пачалася прадзюсарская старонка вашага жыцця?***

— Усё пачалося ў пачатку 2000-х гадоў. Але ў той час такая прафесія, як музычны прадзюсар, была вельмі закрытай. Прыйшлося спасцігаць яе на практыцы. Тады я была мамай дваіх маленькіх сыноў, вучылася ў аспірантуры, але ж душа імкнулася займацца яшчэ нечым. У той час мой муж (лідар арт-групы «Беларусы» Валерый Шмат) пачаў сваю дзейнасць у якасці харавога дырыжора ў федэрацыі прафсаюзаў. І я пачала яму дапамагаць: шукаць рэжысёраў, харэографаў. Праз пару месяцаў стала відавочна: дзякуючы такой дапамозе я, па сутнасці, стала адміністратарам хору. Вось так і аказалася ў музычнай сферы. Мой муж не бачыў сябе на эстрадзе (ён выпускнік народнага артыста СССР Віктара Роўды), таму мы пачалі разам займацца хорам. Але ж пытанне, што мы зможам зарабляць з хорам, не давала мне спакою. І мая камерцыйная жылка пачала шукаць варыянты. Дапамаглі і прафсаюзы, якія растлумачылі, што хор павінен зарабляць грошы на сябе сам. А, як вядома, кожны крызісны момант — гэта кропка для росту і развіцця. І вось ужо 17 гадоў мы паспяхова займаемся творчасцю!

***— У чым заключаецца роля музычнага прадзюсара?***

— Насамрэч, ёсць два тыпы музычных прадзюсараў. Першыя прыдумваюць пэўны музычны праект і пад яго набіраюць артыстаў, музычных кіраўнікоў. Яны ствараюць канцэпцыю. Другі варыянт — калі прадзюсар працуе ў пары з артыстам-прафесіяналам, які ўжо вядомы публіцы. Я асабіста вельмі люблю другі варыянт — працаваць з чалавекам, з асобай. Кожны артыст — гэта свая ўнікальная гісторыя. А мы ж ведаем, што самае цікавае для людзей — сторытэлінг, які яскрава праяўляецца ў творчасці.

***— Ваша прафесія вымушае вас сустракацца, весці перагаворы з вялікай колькасцю людзей. Чаго тут адбываецца больш — камунікацыі ці зносін?***

— Мне здаецца, адно без другога не існуе. У прафесіі прадзюсара вельмі важная частка работы — гэта стасункі з людзьмі. Многія праекты пачынаюцца з ідэі, якая ўзнікае падчас прыемнай размовы за кубкам кавы, а затым пераўтвараецца ў сапраўднае відовішча на вялікіх пляцоўках. Так, напрыклад, узнік фестываль «Вытокі», з якім мы наведалі сем гарадоў Беларусі.

***— Якімі якасцямі павінен валодаць прадзюсар?***

— Самае галоўнае — стрэсаўстойлівасць. З аднаго боку ў цябе — заказчыкі і арганізатары, якія заўсёды вельмі патрабавальныя і хвалююцца за праект, што існуе на пэўным этапе толькі ў тваёй галаве. З другога боку, гэта артысты — людзі творчыя, а гэта асаблівы тып тэмпераменту. Прадзюсар павінен добра ведаць заканадаўства, асновы эканомікі, разбірацца ў падатковай сістэме, аўтарскім праве. Каб ведаць, як можна працаваць, а як нельга. Яшчэ адна якасць — камунікабельнасць. Калі вы не любіце размаўляць з новымі незнаёмымі людзьмі, наўрад ці гэтая прафесія для вас. Веданне псіхалогіі, уменне прадаваць і натхняць. Гэтыя веды вельмі дапамагаюць за 5 хвілін зразумець філасофію жыцця і пажаданні чалавека, які да цябе звярнуўся. Валоданне голасам. Калі ты размаўляеш з заказчыкам па тэлефоне, на першы план выходзіць уменне ясна выказваць свае думкі. Ну і, канешне, уменне спраўляцца з форс-мажорнымі сітуацыямі.

***— Дарэчы, можаце нагадаць якую-небудзь форс-мажорную гісторыю з гастроляў?***

— Я і сёння памятаю адзін выпадак, які здарыўся падчас канцэрта ў Расіі. Я была маладая і нявопытная. І не магла ўявіць, што можна запрасіць вакальны калектыў на канцэрт і пры гэтым без ніякай апаратуры. Дык вось, мы з арт-групай «Беларусы» прыязджаем на пляцоўку, а там, акрамя сцэны, нічога няма. На шчасце, да канцэрта заставалася чатыры гадзіны. Мы знайшлі фірму, афармілі пракат апаратуры, усё было хутка дастаўлена і зманціравана. Канцэрт адбыўся! А я для сябе зрабіла высновы: прадзюсар павінен прадугледзець і пракантраляваць любыя, нават самыя відавочныя рэчы.

***— Жыццё ў такім стрэсе і такой вялікай колькасці задач вас не стамляе?***

— Я вельмі люблю жыць ва ўмовах шматзадачнасці. Неяк малодшы сын запытаў: «Мама, а чаму ў цябе два тэлефоны?» А таму, што па адным я магу гаварыць і ў той жа час пры дапамозе другога штосьці занатоўваць, адпраўляць паведамленні. Гэта мой рытм жыцця, я без гэтага ўжо не існую.

***— Каго з вядомых артыстаў беларускай эстрады вы зараз прадзюсіруеце?***

— Канешне, гэта арт-група «Беларусы». Калектыў, з якім я адбылася як прадзюсар. Гісторыя нашага супрацоўніцтва доўжыцца 17 гадоў! Больш за год я працую з Гюнэш. Яркая спявачка з еўрапейска-ўсходнім каларытам, вельмі таленавітая і запатрабаваная не толькі ў нашай краіне. Але ж я вельмі рада, што яна жыве і працуе менавіта ў Беларусі. Цікавае супрацоўніцтва ў мяне склалася з заслужанай артысткай Рэспублікі Беларусь Жанэт, якое пачыналася з сяброўства. І, канешне, з Аляксандрам Варанішчам, з якім я супрацоўнічаю больш за 10 гадоў, а вось яго канцэртным дырэктарам стала два гады таму, падчас пандэміі. Ён настолькі віртуозна іграе на балалайцы, што заўсёды выклікае ўсплёск эмоцый у гледача.

***— Што для вас як прадзюсара галоўнае ва ўзаемасувязі «артыст — глядач»?***

— Задача прадзюсара — для кожнага артыста знайсці правільную аўдыторыю, а для кожнай аўдыторыі — падабраць правільнага артыста. Каб падчас канцэрта адбываўся сапраўдны абмен энергіяй. Калі пасля канцэрта ад гледачоў я чую словы: «Мы атрымалі такі зарад, што хочацца ісці і тварыць!», лічу, што мая місія выканана. Мы зрабілі самае галоўнае — дастукаліся да эмоцый гледачоў і падарылі ім добры настрой і радасць!

***— Якімі са сваіх праектаў вы асабліва ганарыцеся?***

— З апошніх гэта, канешне, канцэрт «Мільёны сэрцаў», які прайшоў у Палацы Рэспублікі 28 студзеня. Ідэя яго правядзення ўзнікла нечакана. І ў арганізатараў на падрыхтоўку было ўсяго 11 дзён і начэй. Разам з рэжысёрамі Уладзіславам Арцюкоўскай і Ганнай Маторнай мы стварылі сапраўднае тэатралізаванае дзеянне, удзел у якім прынялo 1200 артыстаў. Ну, а выдатныя водгукі пасля канцэрта яшчэ раз прынеслі нам радасць і натхненне!

***— «Узнік фестываль», «нарадзіўся праект» — так лёгка пра гэта казаць. А што трэба рабіць, каб ідэя пераўтварылася ў рэальнасць?***

— Мне часам кажуць знаёмыя: твае мары заўсёды спраўджваюцца. Так, на самай справе мае мары спраўджваюцца. А ўсё ад таго, што калі ў мяне з'яўляецца ідэя, я пачынаю думаць, што магу зрабіць, каб гэтую ідэю рэалізаваць. І планета пачынае круціцца вакол мяне. У выніку ўсё атрымліваецца. Так было, напрыклад, з гастролямі арт-групы «Беларусы» за мяжой. Вельмі захацелася вывезці групу ў іншыя краіны. Распрацавала тактыку і стратэгію гэтай ідэі. Запусціла таргетыраваную рэкламу ў інтэрнэце менавіта па тых краінах, якія мне былі цікавыя. Праз тыдзень мне прыйшла прапанова даць канцэрт у адным з латвійскіх гарадоў. У выніку маёй камунікацыі ў Латвіі адбыўся не адзін канцэрт, а здарыўся цэлае турнэ па гарадах.

***— Многія прафесіі, якія ёсць сёння, відавочна, праз 5—10 гадоў перастануць існаваць. Якія вашы прагнозы наконт прафесіі прадзюсара?***

— Сёння мы бачым, што гэтая прафесія даўно выйшла за рамкі музычнай сферы. Прадзюсары ёсць у кіно, на тэлебачанні, у сферы адукацыі, у сацыяльных сетках. Далей прафесія будзе развівацца, і яе запатрабаванасць толькі ўзрасце. У сучасным грамадстве ёсць вялікі попыт на людзей, якія імкнуцца наперад, умеюць аналізаваць, прагназаваць і дабівацца перамогі!

**Кацярына ТУМАС-ЦІШКЕВІЧ.**
**Фота з асабістага архіва гераіні.**

# «ПРЫЕМНА, ШТО І СЁННЯШНЯГА ЧЫТАЧА МОЖНА ЗАЦІКАВІЦЬ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРАЙ»

## Штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» — 90



**26 лютага 1932 года пабачыў свет першы нумар газеты «Літаратура і мастацтва». Газеты, якая вось ужо 90 гадоў аб'ядноўвае вакол сябе беларускую творчую інтэлігенцыю, а для многіх пісьменнікаў, крытыкаў, навукоўцаў, журналістаў стала часткай біяграфіі. Гэтак, як і для мяне, — у свой час я працавала ў «ЛіМе» загадчыкам аддзела крытыкі. Памятаю ўнікальную творчую атмасферу, кабінеты, якія нагадвалі клубы ці дыскусійныя пляцоўкі — сюды кожны дзень заходзілі паэты і мастакі, кампазітары і артысты, ад мэтраў да пачаткоўцаў, не толькі занесці нейкі матэрыял, але каб сустрэцца, падыскусіраваць...**

Калі пачынаеш рыхтаваць артыкул па гісторыі беларускай літаратуры, нельга абысціся без цытат з колішняга «ЛіМа», які адлюстраваў на сваіх старонках цэлую эпоху. А аналізуючы сённяшнія падзеі, звяртаешся да сённяшняга «ЛіМа» — што ж пішуць пра гэта калегі?

Так, мы жывём у іншай інфармацыйнай прасторы. У нечым змяніліся і літаратура, і мастацтва, і, мабыць, сама творчая інтэлігенцыя, для якой адрасаваны «ЛіМ». Штотыднёвік узначальвае **перакладчык, літаратуразнаўца, гісторык культуры Аляксей ЧАРОТА.** Паслухаем разважанні галоўнага рэдактара пра сённяшні дзень адной з найстарэйшых газет краіны.

### Пра аўдыторыю і аўтараў

— Наш чытач — усе, хто лічыць сябе інтэлігентам, і ўсе, хто мае дачыненне да культуры. У першую чаргу да літаратуры, але і да іншых сфер таксама. Мастакі, артысты, рэжысёры, музыкі... Стараемся асвятляць кожны цікавы творчы праект. «ЛіМ» — гэта ж летапіс беларускай культуры. Відаць, не было такога вядомага пісьменніка, які б не дэбютаваў у свой час на старонках «Літаратуры і мастацтва». І, зразумела, мы стараемся працягваць гэтую традыцыю — адкрываць новыя імёны. Знайсці таленты не так лёгка, моладзь ахвотней вывешвае свае літаратурныя спробы ў сеціве. Надрукавацца на старонцы ў інтэрнэце прасцей, чым у газеце. Ніякай рэдактуры, ніякага адбору... Вывесіў вершы ці апавяданні на сайт і атрымлівай лайкі. Але дасылаюць і нам, прыходзяць... У першую чаргу студэнты факультэта журналістыкі і філалагічнага. Зусім нядаўна ў нас была апублікаваная проза дзвюх студэнтак з гэтых факультэтаў БДУ. Ёсць і матэрыялы, якія можна назваць гістарычнай з'явай, — згадаю шэраг публікацый апошняга твора Алеся Разанава, паэта, які нядаўна сышоў ад нас. Яшчэ пры яго жыцці мы пачалі друкаваць яго кнігу «След самаеда», якую ён паспеў падрыхтаваць, але яна пакуль не выйшла асобным выданнем. У наступным нумары будзе чарговая частка гэтай кнігі. І пры тым, што цяпер цяжка дачакацца водгукаў на любую публікацыю, ужо атрымалі водгукі на твор Разанава, былі і згадкі ў прэсе. Таму прыемна, што і сённяшняга чытача можна зацікавіць інтэлектуальнай беларускай літаратурай.

### Пра сённяшні фармат

— Мы стараемся прысутнічаць у інтэрнэт-прасторы. Ёсць старонка газеты «Літаратура і мастацтва» на сайце Выдавецкага дома «Звязда», старонка ў «Фэйсбуку», дзе таксама змяшчаем свае матэрыялы. Апошнім часам усё менш людзей хочуць трымаць у руках папяровае выданне ці кнігу, таму стараемся звяртаць увагу на бібліятэкі, якія з'яўляюцца нашымі асноўнымі падпісчыкамі. Дзякуючы гэтаму, «ЛіМ» чытаюць нашмат больш людзей, чым лічба накладу. Дарэчы, невыпадкова ў нас ёсць рубрыка «Бібліятэчная прастора». Увогуле, мы не імкнёмся надта мяняць фармат газеты, таму што разумеем, што моладзь жыве ў іншай інфармацыйнай прасторы, а наш чытач — старэйшае пакаленне. Мяняліся назвы рубрык, але па сутнасці задача іх тая ж — адлюстраванне культурнага працэсу нашай краіны. Праўда, ёсць балючае пытанне — літаратурная крытыка. Яно балючае не столькі для нашай газеты, колькі ўвогуле для літаратурнага працэсу, таму што знайсці сёння сур'ёзную крытыку, сур'ёзны разбор літаратурнага твора ну вельмі складана. Не ведаю, з чым звязаны працэс заняпаду літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства... Можа, з тым, што сёння дастаткова тры сказы напісаць на «Фэйсбуку», каб выказацца пра твор? А ў нашай газеце наймагутнейшыя традыцыі крытыкі! Трэба працаваць усім разам, каб іх аднавіць. Супрацоўнічаем з Інстытутам літаратуразнаўства, секцыяй крытыкі Саюза пісьменнікаў Беларусі. Прыдумалі спецыяльную рубрыку «ЛіМ-прэзентацыя».

### «ЛіМ» як частка лёсу

— У нумары газеты, прысвечаным юбілею, мы пастараліся ўспомніць былых супрацоўнікаў, якія шмат зрабілі для выдання. Мікола Трус, намеснік галоўнага рэдактара «ЛіМа», папрацаваў у архівах, пашукаў цікавыя звесткі пра пачатак штотыднёвіка — думаю, для многіх гэта стане адкрыццём. А маё першае знаёмства з «ЛіМам»... нават не магу сказаць, калі адбылося... У раннім дзяцінстве, бо мой бацька ўсё жыццё яго выпісваў, гэтая газета заўсёды была ў нас дома, як і расійская «Литературная газета». Можна сказаць, што на іх я і выхоўваўся. Зразумела, калі ўзначаліў «ЛіМ», успрыняцце выдання змянілася, бо гэта быў мой першы досвед працы ў газеце, дагэтуль я працаваў у часопісах. Змянілася на нейкім «тэхнічным» узроўні, я пачаў разумець, як няпроста ствараць «ЛіМ»... Але газета засталася для мяне ўсё той жа блізкай сэрцу спадарожніцай.

*Што ж, няхай у «ЛіМа» прыбавіцца ўдзячных чытачоў і новых выдатных аўтараў. Шчыра жадаем нашым калегам плёну, натхнення і даўгалецця — да векавога юбілею засталося не так шмат!*

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 22 марта 2022 г. проводит повторный открытый аукцион № 03-У-22 с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Повторный аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на земельном участке в г. Минске, предоставляемом в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, в границах просп. Независимости – Минская кольцевая автомобильная дорога – ул. Всехсвятских – кладбище «Восточное» | 29,9825 | Для строительства объекта «Застройка квартала в границах просп. Независимости – Минская кольцевая автомобильная дорога – ул. Всехсвятских – кладбище «Восточное» | 1 736 548,92 | 347 300,00 | 38 082,72 | Снос зданий и сооружений, попадающих под пятно застройки | 23 447 680,99 |

Возмещение убытков производится лицами, которым предоставляются изымаемые земельные участки.

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **22.03.2022 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток не позднее 16 марта 2022 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № BY18AKBB 36410000000160000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBB BY 2X, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно представляется:**

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона, (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 2 с 1 марта 2022 г. по 16 марта 2022 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам до 16.45).**

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона**, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под подпись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;**

**- единственный участник несостоявшегося аукциона также в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка обязан выполнить условия, предусмотренные в указанном решении, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения), Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон + 375 (17) 363-96-72, официальный сайт организатора аукциона – www.mgcn.by.**

---

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ»!

**Наблюдательным советом Общества**
**30 марта 2022 года в 11.00**
**созывается очередное общее собрание акционеров**

## ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ»

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2021 год и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2022 год.
2. О работе наблюдательного совета в 2021 году. Оценка деятельности директора общества наблюдательным советом. Отзыв наблюдательного совета о годовом балансе общества.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности общества за 2021 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2021 год.
5. О распределении чистой прибыли за 2021 год. О выплате дивидендов за 2021 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли в 2022 году и I квартале 2023 года. Периодичность выплаты дивидендов за 2022 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
8. Об установлении вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
9. Об утврждении норм списания потерь товаров в магазинах самообслуживания в связи с «забывчивостью» покупателей на 2022 год.
10. Об утверждении Устава общества в новой редакции.
11. Об утверждении локальных нормативных актов ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ».

Регистрация участников собрания будет проводится 30 марта 2022 года с 9.30 до 10.45 по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Варвашени, 50. Для регистрации при себе иметь документ, удостоверяющий личность (представитель акционера – и доверенность).

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: с 10.03.2022 по 29.03.2022 в рабочие дни – с 9.00 до 17.00, 30.03.2022 с 09.00 до 10.30, по месту нахождения Общества.

Справки по телефону 017 375-32-16

**НАБЛЮДАТЕЛЬНЫЙ СОВЕТ.**

### Информация о формировании реестра владельцев ценных бумаг ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ»

| | |
|---|---|
| Полное наименование и место нахождение акционерного общества | Открытое акционерное общество «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ» 220137, г. Минск, ул. Варвашени, 50 |
| Наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения, в соответствии с которым осуществляется формирование реестра акционеров | Наблюдательный совет Открытого акционерного общества «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ», 25.02.2022 |
| Дата, на которую осуществляется формирование реестра акционеров | 09.03.2022 |

УНП 100103703

---

В извещении РУП «Торговый дом «Восточный» от 17.02.2022 № 32 (29654) о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, проводимого 10.03.2022, окончание приема заявлений читать в следующей редакции: **окончание приема заявлений – 03.03.2022 в 15.00.** УНП 101127633

---

**Уважаемые акционеры ОАО «Стройтрест №35»!**

**29 марта 2022 года в 15.00**
**состоится годовое общее собрание акционеров**

## ОАО «Стройтрест №35»

**Собрание пройдет по адресу**
**г. Минск ул. Я. Коласа, 38, четвертый этаж, актовый зал**

**Повестка дня собрания:**

**1.** Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год и основных направлениях деятельности на 2022 год.
**2.** О работе наблюдательного совета Общества в 2021 году.
**3.** О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год.
**4.** Об утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2021год.
**5.** Об утверждение порядка использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2021 год. О выплате дивидендов за 2021 год.
**6.** Об утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2021 год и первый квартал 2023 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2022 году.
**7.** Об избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
**8.** О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
**9.** Об утверждение локальных правовых актов Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск ул. Я. Коласа, 38 в кабинете председателя Наблюдательного совета с 8 марта по 28 марта 2022 г в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Регистрация участников собрания с 13.00 до 14.45 по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании по состоянию реестра на 14 марта 2022 года. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность!

УНП 100289278

---

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ**
**ОАО «Управляющая компания холдинга**
**«Лидсельмаш»!**

**28 марта 2022 года состоится годовое общее собрание акционеров ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш», расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, д. 70 (конференц-зал)**

**Повестка дня собрания**

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2021 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2022 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2021 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности общества, распределение прибыли и убытков общества за 2021 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2021 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли (убытков) за 2021 год. О выплате дивидендов за 2021 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли общества на 2022 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии общества.
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. О внесении изменений в устав и принятие его в новой редакции.

**Начало работы собрания в 12 00.**
**Регистрация участников собрания с 11.30 до 11.50.**

***Наблюдательный совет***
***ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».***

УНП 500021638

---

**Могилевский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**информирует о проведении**
**31.03.2022 открытого аукциона**
**по продаже имущества**
**ОАО «Трест Белсантехмонтаж № 1»**

Лот № 1: **капитальное строение с инв № 710/С-73112 – здание гаража на 3 автомашины,** общ. пл. 66 кв. м. **Изолированное помещение с инв № 710/D-80985 – изолированное помещение № 1,** общ. пл. 305,4 кв. м. **Изолированное помещение с инв № 710/D-80986 – изолированное помещение № 2,** общ. пл. 318,4 кв. м. **Изолированное помещение с инв № 710/D-80987 – изолированное помещение № 3**, общ. пл. 1 340,6 кв. м. **Изолир. пом. с инв. № 710/D-80973 –** Изолированное помещение № 1, общ. пл. 11,5 кв. м. **Изолир. пом. с инв № 710/D-80974 – изолированное помещение № 2,** общ. пл. 13,5 кв. м. **Изолир. пом. с инв № 710/D-80975 – изолированное помещение № 3,** общ. пл. 46,8 кв. м. **Изолир. пом. с инв № 710/D-80976 – изолированное помещение № 4,** общ. пл. 15,6 кв. м. **Изолир. пом. с инв № 710/D-80977 – изолированное помещение № 5,** общ. пл. 47,2 кв. м. **Изолир. пом. с инв № 710/D-80978 – изолированное помещение № 6,** общ. пл. 13,9 кв. м. **Изолир. пом. с инв № 710/D-80979 – изолированное помещение № 7,** общ. пл. 18,7 кв. м. **Изолир. пом. с инв № 710/D-80980 – изолированное помещение № 8,** общ. пл. 14,9 кв. м. **Изолир. пом. с инв № 710/D-80981 – изолированное помещение № 9,** общ. пл. 23,3 кв. м. **Изолир. пом. с инв № 710/D-80982 – изолированное помещение № 10,** общ. пл. 10,9 кв. м. **Изолир. пом. с инв № 710/D-80983 – изолированное помещение № 11,** общ. пл. 11,1 кв. м. **Изолир. пом. с инв. № 710/D-80984 – изолированное помещение № 12,** общ. пл. 295,5 кв. м. К каждому из изолированных помещений с инв. № 710/D-8097, инв. № 710/D-80974, инв. № 710/D-80976, инв. № 710/D-80977, инв. № 710/D-80978, инв. № 710/D-80979, инв. № 710/D-80980, инв. № 710/D-80981, инв. № 710/D-80982, инв. № 710/D-80983, инв. № 710/D-80984 относиться общее имущество (отмечено в технических паспортах к объектам недвижимости), а именно: 1 – тамбур (1,7 кв. м), 2 – коридор (43,8 кв. м), 3 – умывальник (1,6 кв. м), 4 – коридор (3,5 кв. м), 5 – туалет (1,4 кв. м), 6 – туалет (1,4 кв. м), 6 – туалет (1,8 кв. м), 9 – умывальник (1,5 кв. м), 17 – тамбур (1,7 кв. м), 25 – тамбур (1,6 кв. м), 27 – лестничная клетка (13,0 кв. м), 28 – лестничная клетка (13,1 кв. м). **Тепловая сеть с инв. № 039-Б. Ограждение ж/б с распашными воротами, инв. № 653-Б. Опоры освещения (12 шт.) инв. № 025-Б. Асфальтная площадка инв. № 654-Б. Навес для хранения дров инв № 166-Б. Навес для кислорода инв № 165-Б.** Имущество расположено по адресу: г. Бобруйск, ул. Западная, 19/2, 19/1-1, 19/1-2, 19/1-3, 19-1, 19-2, 19-3, 19-4, 19-5, 19-6, 19-7, 19-8, 19-9, 19-10, 19-11, 19-12.

***Начальная цена продажи: 588 837,97 бел. руб. с НДС.***

**Сведения о земельном участке:** лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 741000000003000799 (право постоянного пользования, площадь 2,3800 га).

**Аукцион состоится 31 марта 2022 года в 12.00 по** адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел**: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**

Парастак дабрыні

# КУРЫНЫ БУЛЁН ДЛЯ ДУШЫ,

## або Дрэва кахання шукае новы дом

**З кожным годам я ўсё часцей задумваюся над тым, які след, у тым ліку і экалагічны, пакіну пасля сябе. Таму дзень за днём культывую ў сабе свядомае спажыванне і набываю ўсё менш і менш новых рэчаў. Практычна ўсё, што неабходна для дзіцяці, я знаходжу ў суполцы на «Фэйсбуку» «Otdam_darom_by». Ды і сама там рэгулярна раздаю ўсім ахвотным рэчы, якімі з той ці іншай прычыны не карыстаюся. А не так даўно адкрыла для сябе яшчэ дзве цікавыя ініцыятывы — па бясплатным абмене кнігамі і раслінамі.**

Праект «Мне Не Шкада» — для тых, хто любіць чытаць. Але пры гэтым разумее, што кожная кніга — прыродны рэсурс, захаваць які ў нашых сілах. На старонцы праекта ў «Інстаграме» можна даць пачытаць сваю любімую кнігу, а таксама ўзяць чыюсьці, але потым вярнуць. Сярод мноства вокладак маю ўвагу прыцягнуў «Курыны булён для душы», які стаць у маім чытацкім плане на гэты год. Таму адразу ж напісала «бібліятэкару» Ілоне, і мы дамовіліся пра сустрэчу.



Аіхрызон — гэтую расліну называюць яшчэ «дрэвам кахання», бо яе лісцікі сваёй формай нагадваюць сэрцайкі.

У нашым уяўленні слова «бібліятэка» звязана выключна з кнігамі. Як аказалася, існуе і «Бібліятэка раслін». Гэта яшчэ адна інстаграм-пляцоўка, дзе людзі бясплатна абменьваюцца пакуль што ў асноўным пакаёвымі кветкамі. Ідэя належыць **Марыс МАР, заснавальніцы азеляняльнага праекта «Гарадская ферма»**, якая папулярызуе тэму гарадскіх і пакаёвых агародаў.

Пра «Гарадскую ферму» Марыс Мар» я даведалася дзякуючы душэўнай акцыі #расток_дабрыні. Яна праходзіла амаль два гады таму, калі толькі пачалася пандэмія. Каб падтрымаць тых, хто знаходзіўся ў самаізаляцыі, каманда «Гарадской фермы» дасылала па пошце цёплыя лісты, напісаныя ад рукі, з насеннем кветак. Прычым, каб даведацца, якіх менавіта, трэба было іх пасадзіць. Мне тым разам дасталася далікатная гадэцыя. Такіх кветак у нашай вёсцы дагэтуль ні ў кога не было, таму мясцовыя бабулі праяўлялі да ружовай прыгажуні павышаную цікавасць. Дарэчы, падумалася, што кожны можа адправіць такі ж ліст з насеннем — тым самым нават на адлегласці праявіць клопат пра дарагога чалавека.

Дык вось пачынаючы з 2018 года каманда «Гарадской фермы» перыядычна ладзіла «жывыя абмены раслінамі». Людзі прыходзілі ў вызначаныя месцы і час, каб перадаць свае кветкі ці іх чаранкі ў добрыя рукі, знаёміліся, дзяліліся сваімі гісторыямі, вопытам і слухалі адукацыйныя лекцыі. Калі пачалася пандэмія, дзеля бяспекі пра «жывыя сустрэчы» на нейкі час прыйшлося забыцца. Таму і ўзнікла ідэя стварыць асобны партал, старонку, якая б аб'ядноўвала тых, хто аддае, і тых, хто прымае расліны. Так у красавіку 2020 года нарадзілася «Бібліятэка», і абмен перайшоў у анлайнфармат. Гэта вельмі зручна: цяпер аддаць ці забраць расліну можна ў любы час без прывязкі да нейкай даты. Людзі пры дапамозе старонкі ў «Інстаграм» biblio.plant напрамую дамаўляюцца паміж сабой пра сустрэчу і абменьваюцца. Аддаваць сваю расліну ў адказ неабавязкова. Але калі захочаце падзяліцца, вам будуць рады.



Заснавальніца «Бібліятэкі раслін» Марыс МАР са сваёй любімай аўкубай Музай Іванаўнай.

Дрэва кахання, фікус, пакаёвы клён, дэкаратыўны перац, фуксія... Гэтыя і многія іншыя пакаёвыя расліны акурат цяпер шукаюць новы дом. У «Бібліятэцы» можна выбраць любую кветку, якая спадабалася. Тут жа пад фотаздымкам можна пачытаць, як яе даглядаць, і пераканацца, ці падыходзяць умовы вашай кватэры для вырошчвання.

*— Як можна далучыцца да праекта? Ці абавязкова для гэтага жыць у Мінску?* — пацікавілася я ў **валанцёркі праекта «Бібліятэка раслін» Кацярыны ЧЭХАВАЙ-ДАСЬКО.**

— Падзяліцца чаранкамі вельмі проста: у цябе адпачкавалася расліна — ты можаш зрабіць камусьці прыемны падарунак. Каб стаць захавальнікам (так мы называем людзей, якія гатовыя бясплатна дзяліцца прыгажосцю), дастаткова даслаць фота і назву мацярынскай расліны ў асабістыя паведамленні акаўнта «Бібліятэка раслін». Жыць у Мінску зусім не абавязкова, можна мяняцца ў любых гарадах: проста дасылаеце запыт, і мы друкуем.

*— Якія расліны ў асноўным прапануюць?*

— Да нас часцей за ўсё трапляюць звычайныя расліны (напрыклад, усім знаёмыя фіялкі), з якіх, як правіла, і пачынаецца захапленне пакаёвымі кветкамі. Праўда, часам сустракаюцца рэдкія сукуленты і іншыя цікавыя экзэмпляры. У Марыс, напрыклад, ёсць расліна аўкуба па імені Муза Іванаўна (менавіта так звалі жанчыну, з якой дзяўчына пазнаёмілася проста на вуліцы і ад якой ёй гэтая кветка дасталася). Сярод нашых захавальнікаў чаранкі гэтай кветкі раздае толькі яна. Калекцыянеры «палююць» на рэдкія экзэмпляры. Для гэтага ў нас ёсць рубрыка «Хацелкі». Кожны можа даслаць фота расліны сваёй мары — як правіла, іх цяжка знайсці ці яны дорага каштуюць у крамах. Некаторым шанцуе. Бывае так, што ў кагосьці знахозіцца чаранок такой расліны і ён гатовы ім падзяліцца.

*— Мне вельмі спадабалася, што на «жывых абменах» да некаторых кветак прымацоўвалася кранальнае пасланне да будучага гаспадара. Ці практыкуецца такое ў «Бібліятэцы»?*

— На жаль, не, бо мы толькі пасярэднікі, і было б не вельмі зручна кожнага, хто аддае расліну, прасіць пісаць пасланне. Ды і не заўсёды людзі аддаюць менавіта ўласныя расліны. Часам гэта кветкі, знойдзеныя на сметніках. Але калі захавальнік захоча прымацаваць да расліны, якую аддае, нейкае пасланне, мы толькі за.

Праект «Бібліятэка раслін» гуртуе абсалютна розных людзей: і па ўзросце, і па прафесіі. Усіх іх аб'ядноўвае любоў да кветак. Што цікава, сама заснавальніца праекта Марыс па адукацыі эканаміст і з батанікай ці біялогіяй ніяк не звязана. Проста вельмі любіць расліны і лічыць, што менавіта яны выратуюць свет. Марыс неяк сказала, што яе захапляе сама думка: з адной расліны можна начаранкаваць шмат маленькіх і тым самым пасяліць яшчэ крыху ўтульнасці ў іншых дамах.

— Аднойчы я прыйшла на «жывы абмен» і... засталася, мяне вельмі захапіла гэтая тэма, — кажа Кацярына Чэхава-Даська. — «Бібліятэка» для мяне — класнае месца, дзе сустракаюцца людзі з падобнымі інтарэсамі, абменьваюцца раслінамі і вопытам у іх вырошчванні. Гэта натхняе даведвацца больш, дзяліцца, дапамагаць. Лічу, што кожны можа паспяхова даглядаць расліны. Галоўнае — знайсці свае. Пакаёвыя кветкі дома — гэта цудоўна. Гэта перш за ўсё азеляненне прасторы. Каб дома было чыстае паветра, каб вока радавала прыгажосць. Дарэчы, дзякуючы «Бібліятэцы» можна знайсці расліны, якія не купіш у краме. Да таго, як далучыцца да праекта, я марыла пра пеларгонію духмяную, якую ў дзяцінстве бачыла ў бабулі на падаконніку. У выніку знайшла яе ў «Бібліятэцы раслін». Акрамя таго, расліны, якія людзі аддаюць праз «Бібліятэку», маюць добрую энергетыку, бо вырашчаны з любоўю. У іх не дадаюць угнаенні для продажу, таму яны значна больш моцныя, здаровыя.

«Бібліятэка раслін», як і ініцыятыва па абмене кнігамі, — праект экалагічны. Прымаючы і аддаючы мясцовыя чаранкі, вы падтрымліваеце адаптаваныя для вашага рэгіёна расліны. Тым самым змяншаеце вугляродны след і колькасць выкарыстаных хімічных паскаральнікаў росту.



Фота аднаго з апошніх «жывых абменаў раслінамі».

Дарэчы, у «Бібліятэцы» можна дзяліцца не толькі пакаёвымі кветкамі, але і расадай, парасткамі траў, а таксама лішкамі гародніны ды садавіны са сваіх агародаў і садоў.

— У нас ёсць рубрыка «Сезоннае», — кажа Кацярына Чэхава-Даська. — Ёй пакуль нячаста карыстаюцца, але опцыя працуе. Ужо аддавалі клубні тапінамбуру і расаду клубніцы. Хацелася б пашырыць асартымент такіх раслін у «Бібліятэцы», бо далёка не ўсе гараджане ведаюць, што дома на падаконніку рэальна вырасціць цэлы агарод — памідоры, агуркі, зеляніну. Таксама цудоўна растуць у гаршках мята, меліса і кацямятка.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Каб помнілі

# ГЭТАЯ АКЦЫЯ ПАТРЭБНА НЕ ТОЛЬКІ СЁННЯ

### Макеты спаленых фашыстамі вёсак размесцяць ва ўстановах адукацыі і культуры Магілёўскай вобласці

**У Магілёве ў музеі імя П. Масленікава падвялі вынікі абласной патрыятычнай акцыі па стварэнні макетаў вёсак, спаленых у гады Вялікай Айчыннай вайны. У бліжэйшы час макеты будуць перададзены ўстановам адукацыі і культуры, дзе яны размесцяцца ў музеях і экспазіцыях, перадае карэспандэнт БелТА.**



Актыўнымі ўдзельнікамі акцыі сталі дзеці разам з педагогамі. Як адзначыў **старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Анатоль ГЛАЗ,** праект стварэння макетаў спаленых вёсак быў паспяхова рэалізаваны. «Наша акцыя патрэбна не толькі сёння, яна спатрэбіцца нам заўтра. У такіх акцыях і праектах мае патрэбу наша падрастаючае пакаленне», — сказаў ён.

Дыпломы I ступені атрымалі некалькі ўстаноў. Сярод іх Клічаўскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Дзеці разам з педагогамі стварылі макеты вёсак Вязень і Сялец да іх знішчэння фашыстамі. Уладальнікамі 1-га месца таксама сталі сярэдняя школа № 3 Асіповічаў і Лапіцкая сярэдняя школа, навучэнцы якіх аднавілі вёску Макаўе. Гімназія Асіповічаў атрымала 1-е месца за макет вёскі Бортнае.

Паводле слоў **педагога Клічаўскага цэнтра даадукацыі дзяцей і моладзі Наталлі МЯЛЕШКІ,** работа па стварэнні макета пачалася з архіўных дакументаў. Па дапамогу звярталіся ў мясцовы краязнаўчы музей і да ўспамінаў мясцовых жыхароў. «Дзеці праяўлялі вялікую цікавасць да гэтай працы. Некаторыя нават не ведалі, што такое наогул магло быць, каб адны людзі спальвалі іншых. Калі ім нешта расказваеш, яны, бывае, не так успрымаюць інфармацыю, а вось калі самі дакрануліся да гэтай работы — тут зусім ужо іншыя пачуцці і эмоцыі», — расказала педагог.

Другое месца ў абласной акцыі прысуджана сярэдняй школе № 2 г. п. Глуска — школьнікі зрабілі мініяцюру вёскі Белае. Вендарожскі дзіцячы сад — сярэдняя школа Магілёўскага раёна атрымаў дыплом II ступені за макет вёскі Дубінка.

Уладальнікамі 3-га месца ў абласной патрыятычнай акцыі стала Маслакоўская сярэдняя школа Горацкага раёна за макет вёскі Напраснаўка. Такую ж узнагароду заваяваў Чарнуцкі дзіцячы сад — сярэдняя школа Шклоўскага раёна — дзеці стварылі мініяцюру вёскі Рубеж. За макет вёскі Панькоўская Буда дыпломам III ступені ўзнагароджаны Касцюковіцкі раённы цэнтр дзіцячай творчасці.

Адным з членаў журы, якія ацэньвалі прадстаўленыя работы, быў **намеснік пракурора Магілёўскай вобласці Андрэй ВОЛКАЎ.** Ён расказаў, што такія акцыі і праекты зараз вельмі запатрабаваны. «Было складана ацэньваць работы, у іх укладзена вельмі шмат працы. І гэтым пранікліся дзеці, якія ўдзельнічалі ў распрацоўцы і стварэнні макетаў спаленых вёсак, — падкрэсліў ён. — Для нас, як прадстаўнікоў пракуратуры, гэты праект уяўляў асаблівую цікавасць. Цяпер у Беларусі расследуецца крымінальная справа аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У нас шмат архіўных дакументаў, рознай інфармацыі. І з кожным днём колькасць звестак павялічваецца. Ужо ўстаноўлена больш за 1,6 тысячы спаленых вёсак, выяўлена 38 раней неўстаноўленых месцаў масавых пахаванняў. На гэты год запланавана восем пошукавых работ і раскопак. Мы будзем працягваць гэтую працу і расказваць пра яе, каб людзі ведалі і памяталі сваю гісторыю».



# З ПАВАГАЙ ДА ЗЯМЛІ

## У сельгаспрадпрыемстве «Мурава» вяртаюць у севазварот землі з пустых сядзіб, а са старых вясковых хат робяць камфартабельнае жыллё

**Адкрытае акцыянернае таварыства «Мурава» — гаспадарка хоць і прыкметная поспехамі ў Пружанскім раёне, ды зусім невялікая па плошчы, далёкая ад сучасных гігантаў. Тут беражліва ставяцца да любога лапіка зямлі. Адной з крыніц папаўнення плошчаў севазвароту з'яўляецца рэкультывацыя зямлі пад былымі сядзібамі. Гэтую работу гаспадарка вядзе разам з Сухопальскім сельскім Саветам.**



Сям'я ТАРАЗЕВІЧАЎ:
Уладзіслаў і Анастасія з дзецьмі Палінай і Максімам.

На тэрыторыі адміністрацыйнай адзінкі даволі шмат старых дамоў, якія ідуць пад знос. Пасля шэрагу неабходных юрыдычных фармальнасцяў дом прызнаюць безгаспадарчым, ён пераходзіць ва ўласнасць мясцовага органа ўлады.

Скажам, за мінулы год было знесена восем дамоў на тэрыторыі гаспадаркі. Амаль усе выдаткі па ліквідацыі былых пабудоў, а таксама непасрэднае выкананне работ па разборцы ўзяло на сябе сельгаспрадпрыемства. Самі «каробкі» звычайна разбіраюць яшчэ зімой, а з надыходам вясны пляцоўку канчаткова расчышчаюць, праводзяць рэкультывацыю зямлі, рыхтуюць глебу і засяваюць. Напрыклад, у вёсцы Грыневічы дамы пад нумарамі 9,11,13 стаялі на адной вуліцы адзін за адным. Таму вызваліўся ўчастак зямлі, які можна апрацоўваць любой габарытнай тэхнікай. І цяпер замест зараснікаў бур'яну і кустоўя, праз якія жаласліва выглядалі пакошаныя пабудовы, вясной зелянее рунь, а ўвосень радуе вока акуратная ралля.

Але такая тактыка найбольш характэрная для аддаленых вёсак. На цэнтральнай сядзібе, у Мураве, і найбліжэйшых населеных пунктах добраўпарадкаванне ажыццяўляецца такім чынам, што разам са зносам горшых пустых дамоў лепшыя з іх, найбольш трывалыя купляюць і прыводзяць у парадак. Сельгаспрадпрыемства робіць капітальны рамонт з усімі сучаснымі элементамі добраўпарадкавання. У год цяпер рамантуецца па два-тры дамы. І сям'я спецыяліста ці рабочага атрымлівае, па сутнасці, новы дом з усімі камунальнымі выгодамі. Кожны з такіх дамоў абыходзіцца прадпрыемству ў пяць разоў танней, чым новы. А населены пункт набывае сучасную прыгожую сядзібу замест старой, нярэдка закінутай хаты.

— Кадравая палітыка любога сельскагаспадарчага прадпрыемства пачынаецца з жыллёвай праграмы, — адзначае **дырэктар ААТ «Мурава» Пётр БІЛЕЦКІ.** — Сённяшні спецыяліст, работнік зацікаўлены ў атрыманні добраўпарадкаванага, камфортнага, энергаэфектыўнага жылля. І гэта справядлівае патрабаванне.

За час існавання дзяржаўнай праграмы крэдытавання будаўніцтва жылля ў вёсцы тут узвялі пад сотню аднакватэрных дамоў. Апошнім часам стала складана будаваць з нуля, бо льготны крэдыт не кампенсуе яго кошт, і сродкі даводзіцца браць з абаротных актываў, што няпроста нават для эканамічна моцнай гаспадаркі. У «Мураве» знайшлі адназначна своеасаблівае вырашэнне праблемы.

Два гады таму дом пасля рэканструкцыі атрымаў калгасны **кіроўца Аляксей МАСЛЕНІКАЎ.** Жыллё было цалкам гатовае, новы гаспадар адразу завозіў мэблю. А на вуліцы Школьнай год таму справілі наваселле **Уладзіслаў і Анастасія ТАРАЗЕВІЧЫ.** Іх дом выглядае надзвычай сучасным і стыльным. Навасёлы на вуліцу Школьную заязджаюць ахвотна, тут недалёка да школы, дзіцячага садка, іншых вясковых сацыяльных аб'ектаў. На суседняй вуліцы таксама завяршылі рамонт яшчэ аднаго старога дома, да таго ж увялі ў строй новы, пабудаваны з дапамогай ільготнага крэдыту.

— Прадпрыемства праводзіць вялікую работу па добраўпарадкаванні населеных пунктаў, — гаворыць **намеснік дырэктара сельгаспрадпрыемства Аляксандр МАРКЕЧКА.** — Знешні выгляд вёсак таксама працуе на імідж гаспадаркі. Таму клопаты пра добраўпарадкаванне не аддзяляем ад вытворчых задач. Аднойчы нашы краязнаўцы адшукалі звесткі пра першы пісьмовы ўспамін Муравы, датаваны 1563 годам. Не так даўно паставілі валун з гэтай датай. Так што налета нашай вёсцы 460 гадоў.




**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Алены ДАЎЖАНОК.**

УНП 200027333

**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона)
по поручению ЗАО «Завод пластиковой упаковки» (продавец) извещает о проведении
10 марта 2022 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00
по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2**

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. | Задаток (10 %) с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Местонахождение имущества: Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42** | | |
| 1 | Биогазовая электростанция (электрогенератор) Weukesha H24 GLD-200, 2007 года выпуска,серийный номер C17231/1; вырубной штамп производство Германия; маркировочная машина; линия по производству стаканчиков KL2SH KIEFEL, заводской № 3432/54; машина для 6-ти цветной печати OMSO PC/55 AC, 1996 года изготовления, серийный номер APX0103 96; машина печати на полистир. крышках VAN DAM DLC, серийный номер S102675; устройство рукав этикеточный; формопласт FORMO plast 235/80,1981 год изготовления, серийный номер 5367; экструдер ROTEX-40D производства «Kiefel», тип V12, серийный номер 0126; термоформующая машина SPEEDY-BC, производитель – Италия, заводской номер RI236.96, год выпуска 1996 | 494 592,00 | 49 459,20 |
| 2 | Вакуумоформировочная машина для изготовления крышек ILLIG RDM 50/3, 1988 года изготовления, серийный номер 140; жидкотопливный стационарный нагреватель WA33 MASTER; двухшпиндельная бобинорезательная машина SMT63.2-S, производитель – Италия, заводской номер 1 106, год выпуска 2010; термоформовочная машина «Термораннер KTR-3», производитель – Германия, заводской номер 252-036, год выпуска 2009; комплектная термоформовочная машина SWING со станцией предварительного нагрева 2 Heart и наматывающим устройством для отходов, производитель – Германия, заводской номер 5 646, год выпуска 2014; экструзионная линия Battenfeld, производитель – Германия-Австрия, заводской номер 3801091-010, год выпуска 2012; дробилка (измельчитель) типа 1000-G, производитель – Италия-Германия, заводской номер 27 389, год выпуска 1989; двухшпиндельная бобинорезательная машина SMT63.2-S, производитель – Италия, заводской номер 1 241, год выпуска 2013; вымывной процессор Concept 305DW, производитель – Италия, заводской номер 364.114, год выпуска 2013; флексографическая машина «Stimount» (устройство монтажа полимерных форм для фексографии), модель 170/PC-T, производитель – Италия, заводской номер 026MC, год выпуска 1997; станок для монтажа печатных форм Stiman 120-T2, производитель – Италия, заводской номер 007, год выпуска 2007; финпак (линия по производству пищевой полимерной пленки), производитель – Финляндия, заводской номер 892 617, год выпуска 1990; финпак (линия по производству пищевой полимерной пленки), производитель – Финляндия, заводской номер 863 053, год выпуска 1987; машина флексографической печати с центральным барабаном 6 цветов модель SATURNO 1200, производитель – Италия, заводской номер 3 916, год выпуска 2004 | 1 202 664,00 | 120 266,40 |

**Продавец: ЗАО «Завод пластиковой упаковки»**, Гомельская область, г. Речица, ул. Сыдько, д. 115, пом. 11. Контактный телефон +375296555051.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB3012132 2650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 09.03.2022 г. в 17.00.**

**С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу по предварительному согласованию с ликвидатором.**

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом (ИП) РБ – копии свидетельства о государственной регистрации юр. лица (ИП), устава юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность; представителем физ. лица (ИП) РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, физ. лица, ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет 31, 32, 33 стр. паспорта, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона:
+375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**ПО ПРОДАЖЕ КАПИТАЛЬНОГО СТРОЕНИЯ**

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Могилевское областное управление № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | **Лот № 1.** Капитальное строение (4 гаража) с инвентарным № 720/С-12316, расположенное по адресу: Могилевская область, г. Горки, ул. Ивана Якубовского, 36А, площадью 108,72 кв. м, год постройки – 1995.<br>**Лот № 2.** Капитальное строение (2 гаража) с инвентарным № 720/С-12324, расположенное по адресу: Могилевская область, г. Горки, ул. Ивана Якубовского, 36А/1, площадью 156,0 кв. м, год постройки – 1995 |
| **Начальная цена продажи** | Лот № 1 – 27720,00 (двадцать семь тысяч семьсот двадцать белорусских рублей, 00 копеек), в т. ч. НДС 20 % – 4620,00 (четыре тысячи шестьсот двадцать белорусских рублей 00 копеек).<br>Лот № 2 – 39781,56 руб. (тридцать девять тысяч семьсот восемьдесят один рубль 56 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 6630,26 руб. (шесть тысяч шестьсот тридцать белорусских рублей 26 копеек) |
| **Сумма задатка** | Лот № 1 – 1386,00 (одна тысяча триста восемьдесят шесть белорусских рублей 00 копеек) – 5 %.<br>Лот № 2 – 1989,08 (одна тысяча девятьсот восемьдесят девять белорусских рублей 08 копеек) – 5 % |
| **Открытый аукцион состоится** | **29.03.2022 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | В рабочие дни с 9.00 до 16.00 по 28.03.2022 включительно по адресу: г. Могилев, ул. 30 лет Победы, д. 3, второй этаж, кабинет 209 |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: (8-0222) 632792, моб. 8029-169-39-68 |

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере по 1 лоту 1386,00 белорусских рублей, по второму лоту 1989,08 белорусских рублей на счет № BY 69 AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Заключительная регистрация участников аукциона – 29 марта 2022 г. с 10.30 до 10.55. В случае нерегистрации в выше назначенное время участник не допускается к участию в аукционе. Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены по каждому лоту отдельно. Шаг аукциона – 5 % от первоначальной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 40 банковских дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона.

# ПАКУТЫ СТАРОГА СВЕТУ

## Чаму Еўропу накрыў найцяжэйшы «дэпрэсняк»?





**Рэзкі скачок цэн на энергарэсурсы — цяжкі ўдар па эканоміцы еўразоны і, адпаведна, па кашальках еўрапейцаў. Разам з заўважным ростам імпарту з Кітая гэтыя фактары прывялі 19 еўрапейскіх краін з адзінай валютай у снежні мінулага года да самага вялікага за 13 гадоў дэфіцыту гандлёвага балансу. Такія несуцяшальныя даныя на мінулым тыдні агучыў Eurostat. «Імпарт узляцеў да нябёсаў», — патлумачыў Financial Times горкія вынікі Клаус Вістэсен з Pantheon Macroeconomics. Гэты паказчык у еўразоне ў апошнім месяцы мінулага года павялічыўся ў параўнанні са снежнем 2020-га на нябачаныя 36,7 %. У Eurostat лічаць, што адной з прычын росту з'яўляецца энергетычны крызіс, які бушуе ў Старым Свеце з восені і справакаваў рэзкі рост цэн на газ, нафту і электраэнергію. Еўропа ў цэлым і еўразона ў прыватнасці моцна залежаць ад паставак газу і нафты звонку. У выніку дэфіцыт гандлёвага балансу зоны адзінай валюты павялічыўся ў снежні да 9,7 мільярда еўра (1,8 млрд еўра ў лістападзе). Глабальны фінансавы расклад напрамую ўплывае на дабрабыт жыхароў Старога Свету — адбываецца шквальны рост цэн па ўсіх напрамках, вядома, без адпаведнага павышэння заробкаў. Узнікае зразумелая сацыяльная напружанасць. Чаму Еўропу накрыў найцяжэйшы «дэпрэсняк»?**

### Расчаравальныя вынікі

Звесткі па ўсім Еўрасаюзе па выніках снежня мінулага года яшчэ больш расчаравальныя: агульны гандлёвы дэфіцыт склаў 17,2 мільярда еўра. Летась ЕС крыху павялічыў прафіцыт у гандлі з ЗША і Вялікабрытаніяй, але гэтая прыбаўка аказалася занадта маленькай для таго, каб кампенсаваць рэзкі рост дэфіцыту балансу гандлю з Кітаем, які склаў амаль чвэрць трыльёна еўра, паведаміў expert.ru.

У гандлі паміж Еўрасаюзам і Вялікабрытаніяй па-ранейшаму заўважныя сляды разрываў ланцужкоў, выкліканых пераходным перыядам пасля брэксіту, які скончыўся напрыканцы 2020-га. Канчатковы выхад краіны з Еўрасаюза прывёў да з'яўлення тарыфаў на вялікую колькасць тавараў. Экспарт тавараў ЕС у Вялікабрытанію ў мінулым годзе павялічыўся на 1,9 %. Гэта істотна ніжэй, чым рост экспарту ў іншыя буйныя гандлёвыя партнёры аб'яднанай Еўропы. Праўда, імпарт брытанскіх тавараў упаў у 2021 г. на 13,6 %, хоць пастаўкі з іншых краін у Еўропу ўзраслі.

Дарэчы, бюджэтны дэфіцыт — старая праблема Злучанага Каралеўства. Брытанцы змаглі знізіць яго ў 2018/19 бюджэтным годзе (традыцыйна завяршаецца ў сакавіку) да €24,7 млрд. Па звестках ONS, гэта быў мінімум за 17 гадоў, але ў 2020/21 ён узляцеў да €214,9 млрд. Сёлета наўрад ці ўдасца вырашыць праблему. У лютым мэр Лондана Садзік Хан з-за пагрозы дэфіцыту ў €1,5 млрд заявіў аб намерах зачыніць метро, некалькі дарог, мастоў і тунэляў на некалькі дзён, каб кампенсаваць страты. Многія крытыкі кабінета Барыса Джонсана мяркуюць, што стан брытанскіх фінансаў занадта дрэнны і накіроўваць атрыманыя сродкі варта толькі на ўнутрыдзяржаўныя праблемы, а не на знешнепалітычныя гульні, якія так упадабаў цяперашні прэм'ер.

Высокая залежнасць Еўропы ад Расіі, якая пастаўляе на кантынент амаль 40 % спажыванага еўрапейцамі газу і трэць нафты, на думку FT, выявілася апошнім часам. Газ цяпер, напрыклад, каштуе значна даражэй, чым у лютым мінулага года. Рост імпарту ЕС з Расіі летась вырас на дзве трацiны, а дэфіцыт гандлёвага балансу павялічыўся да 69,2 мільярда еўра. Найбольш ад перабояў з пастаўкамі газу пацерпяць Аўстрыя, Грэцыя і Італія. Што ж датычыцца галін прамысловасці, то найбольш пацярпелымі будуць здабывальная, папяровая і хімічная сферы.

Сітуацыя з таварамі на Захадзе ўсё ж так і не перарасла ў паўтарэнне савецкага дэфіцыту, заўважыў у сваім артыкуле для tass.ru вядомы расійскі эканаміст, дырэктар Інстытута новага грамадства Васіль Калташоў. Тым не менш эксперты адзначаюць, што мае месца схаванае, нелінейнае і паўзучае абясцэньванне грашовых знакаў у таварным выражэнні. Гандлёвыя і вытворчыя фірмы ЗША, Вялікабрытаніі і ЕС выкарыстоўвалі сітуацыі дэфіцыту для павышэння цэн.

Галоўны дэфіцыт Захаду складаўся зусім не ў часовых і частковых перабоях паставак тавараў, а ў дэфіцытнасці знешняга гандлю ці недахопу грошай у бюджэтах урадаў і вялікіх дзяржаўных даўгах. Нягледзячы на тое, што па выніках мінулага года ЕС меў прафіцыт у €128,4 млрд, гэты паказчык скараціўся амаль на €100 млрд з 2020-га.



### Крызіс на крызісе

Яшчэ ў пачатку пандэміі каранавіруса многія прагназавалі: пасля таго, як медыцынскі аспект адыдзе на другі план, пандэмічны крызіс пераўтворыцца ў эканамічны і скалыне свет. Ён будзе згубны, літаральна смертаносны для простага народа, працоўнага класа, а вось кіруючай эліце турбавацца няма чаго. Як і чакалася, пандэмія дапамагла яшчэ больш разбагацець найбагацейшым: яны больш чым удвая прымножылі свае мільярды. Пра гэта гаворыцца ў артыкуле харвацкага выдання Advance.

Маштабны экзістэнцыяльны крызіс ідзе рука аб руку з ростам цэн на энерганосьбіты. «Ці вінаватая ў гэтым пандэмія? Неабавязкова. Як і ва ўсіх выпадках, напрыклад, калі гаворка ідзе пра інфляцыю, дэфіцыт, перабоі ў лагістычных пастаўках, пандэмія — адна з прычын, але не адзіная. Возьмем у якасці прыкладу інфляцыю, якая зараз рэзка расце ў Злучаных Штатах, што, дарэчы, вельмі негатыўна адаб'ецца на жыцці ў Еўропе, як і ўсе астатнія амерыканскія крызісы. Асноўная прычына — няспыннае друкаванне амерыканскіх долараў.

На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў у гэтым «не бачылі праблемы» (хоць яна ёсць), а дакладней з таго часу, як амерыканскі долар, рэзервовая сусветная валюта, перастаў быць чымсьці забяспечаны (раней ён быў забяспечаны золатам), акрамя як верай у тое, што ЗША застануцца вядучай дзяржавай свету», — адзначаецца ў артыкуле Advance. Пандэмія і праблемы, з ёй звязаныя, у тым ліку, напрыклад, цяперашнія востры недахоп работнікаў амаль ва ўсіх сектарах з-за хваробы або ізаляцыі з прычыны «амікрону», — гэта толькі каталізатары для тых праблем, якія назапасіліся раней. Рана ці позна яны б праявіліся ва ўсім свеце, але зараз удар будзе куды мацнейшы, паколькі часу для адаптацыі не застаецца, лічаць эксперты.

У апошнія дні часта пішуць пра непазбежнае сур'ёзнае падаражанне шэрагу паслуг і груп тавараў, пачынаючы з цырульняў і аўтасэрвісаў і заканчваючы мясам і дровамі. Рост цэн у некаторых сегментах ужо прыкметны, але падобнае анансаванне «сур'ёзнага падаражэння» зараз ператворыцца ў свайго роду прароцтва. «Ці плануюць дзяржавы нейкім чынам выратаваць уласны народ, замарозіўшы цэны на асноўныя прадукты і распачаўшы аналагічныя крокі? Можа, яны зоймуцца гэтым толькі тады, калі адчуюць, што ўжо рукой падаць да рэвалюцыі ці паўстання, а ў адваротным выпадку наўрад ці. Насамрэч зараз мы назіраем за тым, як Еўропа сама звязвае сябе па руках і нагах і кідаецца ў бездань. Якасць жыцця цесна звязана з адным з асноўных рэсурсаў — энергіяй, а Еўропа адпраўляе сваю энергетычную бяспеку дзеля нейкіх мэт і інтарэсаў, якія нават яе ўласнымі і не з'яўляюцца», — адзначыла Advance.

### Новая рэчаіснасць

Склалася сітуацыя, у якой Еўропа вымушана закупляць выключна дарагі амерыканскі звадкаваны прыродны газ, які дастаўляецца праз Атлантыку, і ўсё толькі дзеля рэалізацыі плана па ізаляцыі Расіі. Такім чынам Стары Свет здзяйсняе два амерыканскія жаданні: адварочваецца ад Расіі і напаўняе амерыканскія кішэні, плацячы за амерыканскі газ. Выконваюцца два амерыканскія жаданні, але еўрапейскага — ніводнага, заўважыла Advance.

«У Харватыі пры ўсіх гэтых крызісах, якія наслойваюцца адзін на другі, склалася вельмі спецыфічная сітуацыя. З 1 студзеня 2023 года Харватыя пяройдзе на еўра, і ўжо з верасня бягучага года ўсе цэннікі на тавары будуць у еўра і кунах. Усе краіны, якія перайшлі на еўра, перажылі значны скачок цэн на тавары, у тым ліку тавары першай неабходнасці і прадукты харчавання. Гэта значыць, мы бачым, як нас псіхалагічна рыхтуюць да новай, больш цяжкай рэчаіснасці, якая разгорнецца і без таго ў цяжкі перыяд», — паведамляе Advance.

Сітуацыя складаная не толькі праз вірус. Яе пагаршаюць, прычым наўмысна, памылковымі рашэннямі. З іншага боку, наіўна было б чакаць нечага іншага. Пандэмія толькі пагоршыла ўнутраныя супярэчнасці і хісткасць капіталістычнай сістэмы. «Сам факт таго, што падчас глабальнай катастрофы капіталы багатых так растуць, — відавочны паказчык таго, што гэтая класавая сістэма выгадная толькі аднаму класу, а эксплуатаваных яна кідае на волю лёсу і ўсё глыбейшых крызісаў. Несумненна, пачнецца змаганне з сістэмай масавай эксплуатацыі, але вялікае пытанне — хто яе будзе весці і з якімі мэтамі? Відома, маштабныя крызісы — гэта яшчэ і вялікія магчымасці, але сапраўды гэтак жа яны ўяўляюць і вялікую небяспеку. Маштабныя крызісы могуць стаць трамплінам для вельмі небяспечных палітыкаў, якім натоўпы роспачных выбаршчыкаў лёгка дадуць шанц», — лічыць Advance.

### Трывожныя высновы

Не ўздымаюць агульны песімістычны настрой еўрапейцаў і несуцяшальныя навіны па той бок акіяна. Ад Амерыкі адварочваецца яе будучыня: большасць амерыканскай моладзі лічыць, што дэмакратыя ў ЗША ў небяспецы ці ўвогуле правалілася. Амерыканская трагедыя — страта Злучанымі Штатамі каштоўнасці ў вачах новага пакалення амерыканцаў — гэта трагедыя і дзясяткаў краін-сатэлітаў Амерыкі, у тым ліку еўрапейскіх, для якіх ЗША застаюцца пуцяводнай зоркай. Гэтыя краіны імкнуцца да ідэалу, якога для ўсё большай колькасці саміх амерыканцаў не існуе, заўважыў аналітычны партал RuBaltic.

«Большасць (52 працэнты) маладых амерыканцаў лічаць, што дэмакратыя ў краіне альбо «ў бядзе», альбо «правалілася». Толькі 7 % маладых амерыканцаў лічаць Злучаныя Штаты «здаровай дэмакратыяй»; 27 % ахарактарызавалі амерыканскую нацыю як «дэмакратыя, якая функцыянуе часткова», 39 % — як «дэмакратыю ў бядзе», а 13 % зайшлі так далёка, што абвясцілі нацыю «няўдалай дэмакратыяй», — адзначаецца ў даследаванні Школы кіравання імя Джона Кенэдзі ў Гарвардскім універсітэце (Harvard Kennedy School).

Прэстыжная ўстанова больш за 20 гадоў праводзіць маніторынг палітычных поглядаў амерыканскай моладзі і прызнае, што ніколі яшчэ яе высновы не былі такімі трывожнымі. «Пасля рэкорднай колькасці пратэсных выступленняў у 2020 годзе маладыя амерыканцы б'юць трывогу. Калі яны глядзяць на Амерыку, якую хутка атрымаюць у спадчыну, то бачаць, што дэмакратыя і клімат у небяспецы, а Вашынгтон больш зацікаўлены ў канфрантацыі, чым у кампрамісе», — кажа дырэктар Інстытута грамадскай думкі гарвардскай школы кіравання (IOP), які праводзіў даследаванне, Джон Дэла Вольпе.

На думку сацыёлага, маладыя грамадзяне Амерыкі «здаецца, поўныя рашучасці змагацца за перамены, да якіх імкнуцца». Гэта значыць, пасля афраамерыканскіх беспарадкаў Black Lives Matters і штурму ўльтраправымі Капітолія навукоўцы прагназуюць у Злучаных Штатах масавы пратэст незадаволенай моладзі супраць сістэмы ўлады ў Вашынгтоне, якую гэтая моладзь не лічыць паспяховай дэмакратыяй.

Большасць маладых амерыканцаў сутыкаюцца з праблемамі псіхічнага здароўя: больш за палову маладых людзей паведамлялі апытальнікам, што апошнім часам адчувалі прыгнечанасць і безнадзейнасць. Падобныя працэсы ў амерыканскім грамадстве разгортваюцца на фоне спроб адміністрацыі Джозэфа Байдэна выбудаваць новую ідэалогію знешняй палітыкі ЗША вакол спрэчнай выявы дэмакратыі. Белы дом дзеліць знешні свет на дэмакратыі і аўтакратыі, арганізоўвае саміты дэмакратый супраць аўтакратый.

«Пакуль вашынгтонская адміністрацыя вешае на Расію цэтлік «аўтарытарны рэжым Уладзіміра Пуціна», самі амерыканцы называюць сваю эліту прагнілым і карумпаваным «вашынгтонскім балотам». У самой Амерыцы ў моду ў большасці ўвайшло пагардліва-прыніжальнае стаўленне да сваёй краіны. Называць яе бананавай рэспублікай, недаразвітой колішняй брытанскай калоніяй, якая і сапраўды нічым не лепшая за Гандурас, — сёння ў амерыканскай публічнай прасторы добры тон», — піша RuBaltic. У якой-небудзь Літве палітыкі кіручай партыі на тэлебачанні заяўляюць, што без ЗША зараз не было б гэтай краіны, а ў ЗША тым часам «прагрэсіўныя» натоўп каляровых феміністаў і ЛГБТ-актывістаў валіць помнік чарговаму вялікаму амерыканцу і крычыць, што Амерыка — гэта зло і яна ніколі не была вялікай. Як адзначае RuBaltic, за гэтым натоўпам будучыня, таму што ён малады і пасіянарны.

Так што дэпрэсіўнай Еўропе ёсць на каго раўняцца.

**Захар БУРАК.**

# ОАО «Красный Октябрь»

## ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 30 марта 2022 года в 11.00 ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ

**по адресу: г. Витебск, проспект Генерала Людникова, 10/3**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год и перспективы развития на 2022 год.
2. Отчет наблюдательного совета о работе в 2021 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о работе в 2021 году.
4. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2021 год.
5. О распределении чистой прибыли Общества за 2021 год и о дивидендах за 2021 год.
6. Об утверждении направлений распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества в 2022 году.
7. Утверждение Устава в новой редакции.
8. Утверждение «Положения о наблюдательном совете».
9. Утверждение «Положения о порядке определения и учета аффилированных лиц».
10. О безвозмездной (спонсорской) помощи.
11. Избрание членов наблюдательного совета ОАО «Красный Октябрь».
12. Избрание членов ревизионной комиссии ОАО «Красный Октябрь».

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться в приемной Общества с 22 марта 2022 г. по 29 марта 2022 г. в рабочие дни (понедельник–пятница) с 8.30 до 12.00 и с 12.30 до 17.00 и 30 марта 2022 г. по месту проведения собрания.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет производиться в день проведения собрания с 10.00 до 10.45.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 1 марта 2022 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

**Справки по тел. (80212) 52-55-70.**

***Наблюдательный совет ОАО «Красный Октябрь».***

УНП 300003144

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества
ОАО «Круглянский агропромтехснаб»
(Продавец)**

## **Лот № 240222001:** ЗДАНИЕ БАНИ,

инв. № 722/С-3834, 229 кв. м.

**Начальная цена с НДС** – 43 201,03 руб.

**Задаток** – 4 320,00 руб. **Адрес:** Могилевская обл., Круглянский р-н, гп Круглое, ул. Парковая, д. 8а.

**Штраф** – 5 000,00 руб.

Земельный участок площадью 0,0338 га с кадастровым номером 724255100001001413. Право постоянного пользования.

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Электронные торги состоятся 30.03.2022 в 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»).** Шаг аукциона – 5 %.

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах, условиях участия, сроке подписания договора купли-продажи, условиях оплаты размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **28.03.2022 в 11.00.**

**Организатор электронных торгов:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • www.торги.бел • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## Извещение о проведении 29 марта 2022 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование имущества | Год выпуска | Инвентарный номер | Номер шасси | Начальная цена, бел. руб., без учета НДС | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | Полуприцеп МАЗ-9758 061 | 2001 | 5003839 | Y3M97580010003817 | 3 510,00 | 300,00 |
| 2 | Автобус МАЗ-256300 | 2006 | 5003667 | Y3M25630060000609 | 8 300,00 | 800,00 |
| 3 | Бортовой МАЗ-437043-328 | 2008 | 5003832 | Y3M43704380000633 | 3 610,00 | 300,00 |
| 4 | Бортовой МАЗ-437043-328 | 2008 | 5003834 | Y3M43704380000629 | 4 130,00 | 400,00 |
| 5 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2008 | 5003744 | Y3M54400880006124 | 7 010,00 | 700,00 |
| 6 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2008 | 5003746 | Y3M54400880006122 | 7 320,00 | 700,00 |
| 7 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2008 | 5003745 | Y3M54400680006125 | 9 400,00 | 900,00 |
| 8 | Автобус МАЗ-152021 | 2002 | 5003398 | Y3M15202120000097 | 5 590,00 | 500,00 |
| 9 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2007 | 5003710 | Y3M54400870005867 | 5 090,00 | 500,00 |
| 10 | МАЗ-6303А3 (кс-55727-1) | 2008 | 4253640 | Y3M6303A370000002 | 52 590,00 | 5000,00 |
| 11 | Полуприцеп МАЗ-975830-3032 | 2006 | 5003902 | Y3M97583060001454 | 7 720,00 | 700,00 |
| 12 | Бортовой МАЗ-6312А9-320-010 | 2009 | 5003903 | Y3M6312A990000021 | 20 950,00 | 2000,00 |
| 13 | МАЗ-182K 40 | 2013 | 5004460 | Y3M182K40D0000001 | 5 140,00 | 500,00 |
| 14 | МАЗ-182040 | 2013 | 5004463 | Y3M182040D0000001 | 9 110,00 | 900,00 |
| 15 | МАЗ-182G40 | 2013 | 5004462 | Y3M182G40D0000001 | 6 400,00 | 600,00 |
| 16 | МАЗ-182010 | 2012 | 5004201 | Y3M182010C0000007 | 6 340,00 | 600,00 |
| 17 | МАЗ-5440А8-360-031 | 2010 | 5003927 | Y3M5440A8A0001972 | 12 920,00 | 1200,00 |
| 18 | МАЗ-5902А2-390 (Специальная техника) | 2010 | 4509934 | Y3M5337A2A0002920 | 21 990,00 | 2100,00 |
| 19 | МАЗ-9758 | 2001 | 5003229 | Y3M97580010003863 | 7 440,00 | 700,00 |
| 20 | МАЗ-9758 | 2004 | 5000413 | Y3M97580030006091 | 3 070,00 | 300,00 |
| 21 | ГАЗ-2705 | 2005 | 5003498 | X9627050060094389 | 1 380,00 | 100,00 |
| 22 | МАЗ-6303А3 (КС-55727-7) | 2008 | 4253968 | Y3M6303A380000524 | 61 840,00 | 6100,00 |
| 23 | Бортовой МАЗ-534019 | 2007 | 5003955 | Y3M53401970000001 | 12 550,00 | 1200,00 |
| 24 | Прицеп МАЗ-837810-3010 | 2006 | 5003963 | Y3M83781060000001 | 5 100,00 | 500,00 |
| 25 | Полуприцеп МАЗ-975830 | 2003 | 5003316 | Y3M97583030000007 | 3 370,00 | 300,00 |
| 26 | Полуприцеп МАЗ-93866-40 | 1989 | 5002114 | 2132 | 2 580,00 | 200,00 |
| 27 | Полуприцеп МАЗ-975830-3012 | 2004 | 5003419 | Y3M97583040000420 | 4 500,00 | 400,00 |
| 28 | Полуприцеп МАЗ-975800-012 | 2005 | 5003485 | Y3M97580050007756 | 4 500,00 | 400,00 |
| 29 | АГП МАЗ-5337 (ПМС-328) | 1999 | 4239395 | Y3M533700X0035351 | 8 050,00 | 800,00 |
| 30 | Автовышка МАЗ-437030 (АГП-20-2) | 2008 | 4254100 | Y3M43703070000047 | 12 600,00 | 1200,00 |
| 31 | Седельный тягач МАЗ-544069-320-021 | 2006 | 5004020 | Y3M54406960000460 | 17 590,00 | 1700,00 |
| 32 | Прицеп МАЗ-9919 | 2000 | 5003515 | Y3M991900Y0000149 | 5 450,00 | 500,00 |
| 33 | Самосвал МАЗ-5516W4-4425-010 | 2014 | 5004593 | Y3M5516W4E0000040 | 30 600,00 | 3000,00 |
| 34 | Седельный тягач МАЗ-5440Е9-551-031 | 2013 | 5004621 | Y3M5440E9D0000235 | 76 080,00 | 7000,00 |
| 35 | Седельный тягач МАЗ-5440А8-360-031 | 2014 | 5004596 | Y3M5440A8E0003323 | 37 300,00 | 3000,00 |
| 36 | Седельный тягач МАЗ-5440А8-360-031 | 2014 | 5004597 | Y3M5440A8E0003330 | 37 300,00 | 3000,00 |
| 37 | Седельный тягач МАЗ-643008-068-712 | 2010 | 5004008 | Y3M643008A0001304 | 39 400,00 | 3000,00 |
| 38 | Седельный тягач МАЗ-643008-029-011 | 2006 | 5003727 | Y3M64300860000285 | 12 680,00 | 1200,00 |
| 39 | Седельный тягач МАЗ-643008 | 2001 | 5003845 | Y3M64300810000022 | 8 920,00 | 800,00 |
| 40 | Бортовой МАЗ-5336А5 | 2007 | 5003850 | Y3M5336A570000001 | 7 440,00 | 700,00 |
| 41 | Полуприцеп МАЗ-975800-012 | 2002 | 5003852 | Y3M97580020004767 | 4 680,00 | 400,00 |
| 42 | Седельный тягач МАЗ-5440А9-320-031 | 2008 | 5003870 | Y3M5440A980000023 | 18 120,00 | 1800,00 |
| 43 | Седельный тягач МАЗ-544008-030-021 | 2005 | 5003871 | Y3M54400850001737 | 11 130,00 | 1100,00 |
| 44 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2006 | 5003951 | Y3M54400860002344 | 8 240,00 | 800,00 |

**Местонахождение имущества:**
Позиции 1–32: г. Минск, ул. Промышленная, 2;
позиции 33–37: г. Минск, пер. Промышленный, 7;
позиции 38–44: г. Могилев, ул. Крупской, 232.

**Продавец имущества:** ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 29.03.2022 по предмету торгов №__.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **29 марта 2022 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 28.02.2022 по 25.03.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 395-62-96 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

# ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

